Державна
Наукова Бібліотека
ім. Короленко. Харків

ПЕР. КОРОЛЕНКО 18
БИБ. КВ. КОРОЛЕНКО
1.12

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 247 (6223) | 24 кастрычніка 1938 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

У Совеце Народных Камісараў Саюза ССР. Аб незаконнай арганізацыі пры калгасах прамысловых прадпрыемстваў, не звязаных з сельскагаспадарчай вытворчасцю.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ:

Ф. Ф. Ерзмухін — Самастойна авалодваць марксізмам-ленінізмам.

Выбары кіруючых комсамольскіх органаў. На высокім ідэйным узроўні. **С. Бачура** — На комсамольскіх сходах Палесся.

Адкрылася алімпіяда мастацкай самадзейнасці Менскай вобласці.

АРТЫКУЛЫ:

В. Плішкін — Дакументы вялікіх дзён.
Ш. Афанасьеў — У баях за радзіму.
Ал. Карповіч — Жорж Бізэ.
Н. Гіршын — Спаборніцтва начальнікаў цэхаў і брыгадзіраў.
П. Кавалёў — Вялікае свята совецкага мастацтва.
З апошняй пошты.
Маленькі фельетон: С. Краўцоў — Лірычная душа.

ЗА РУБЯЖОМ:

Становішча ў Чэхаславакіі: — Правакацыя венгерскіх фашыстаў. — Рэакцыйныя мерапрыемствы славацкага ўрада. — Высылка чэшскага насельніцтва з Цешынскай Сілезіі.

Узмацненне блакады рэспубліканскай Іспаніі.

Пагаршэнне харчовага становішча ў Германіі.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі.

Ледакол „Седов“

Капітану БАДЗІГІНУ, парторгу ТРАФІМАВУ

У гадавіну дрэйфа шлем вам і ўсяму экіпажу „Седова“ гарачае прывітанне. Упэўнены, што з большэвіцкай цвёрдасцю совецкіх людзей вы пераможаце ўсе труднасці на вашым шляху і вернецеся на радзіму пераможцамі.

Ціснем вашы рукі, таварышы!

Па даручэнню ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР
І. СТАЛІН, В. МОЛАТАЎ.

АЖЫВІЦЬ РАБОТУ ПАЛІТАСВЕТНЫХ УСТАНОЎ НА ВЁСЦЫ

У калгасах нашай рэспублікі ўжо заканчваецца сельскагаспадарчы год. Восень падагуліла гадавую работу калгаснікаў. Яна радуе іх высокім ураджаем, важкім працаднём, далейшым ростам заможнасці. Для калгаснай вёскі гэты год быў новым буйным крокам на шляху ўздыму і росквіту. Надыходзячую зіму калгаснік сустракае ва ўмовах яшчэ большага паляпшэння добрабыту і росту матэрыяльных багаццяў. У далёкім мінулым астаўся час поўжабрацкага, беспрасветнага існавання працоўнага селяніна. Партыя Леніна—Сталіна праз калектывізацыю адкрыла яму шлях да светлага, шчаслівага жыцця. Стаўшы на гэты шлях, вёска змяніла сваё аблічча, змяніліся яе людзі, яе быт.

З ростам матэрыяльных багаццяў калгаснай вёскі штогод расце і яе культура. Адным з праваднікоў новай соцыялістычнай культуры на вёсцы з'яўляецца абшырная сетка палітасветных устаноў. У Совецкай Беларусі, як і ва ўсіх брацкіх рэспубліках Совецкага Саюза, не знойдзецца раённага і сельсовецкага цэнтра, не знойдзецца ні аднаго буйнага калгаса, які-б не меў Дома соцыялістычнай культуры, або калгаснага клуба, або хаты-чытальні. Колькасць палітасветных устаноў на вёсцы вырасла асабліва за апошнія годы. У гэтым з усёй яркасцю выражаюцца вялікія клопаты большэвіцкай партыі і совецкай улады аб падвальненні ўзросшых культурных запросаў калгаснага сялянства.

Дом соцыялістычнай культуры, калгасны клуб, хата-чытальня — гэта культурныя ачагі калгаснай вёскі. Яны з'яўляюцца і месцам цікавага і карыснага адпачынку, і месцам вучобы, і месцам разгортвання мастацкай самадзейнасці калгаснікаў. Асабліва ўвосень і зімой вакол іх канцэнтруецца ўся асноўная культурна-масавая і палітыка-выхаваўчая работа мясцовых партыйных і комсамольскіх арганізацый. І звычайна там, дзе добра працуе клуб, дзе згрупован вакол яго актыў, дзе сістэматычна праводзяцца культурна-масавыя мерапрыемствы,— там няма месца такім пражыткам мінулага, як хуліганства і п'янка, там цікава скарыстоўвае свой вольны час моладзь, там падарвана ўсякая глеба для дзейнасці класава-варожых элементаў.

Станоўчых прыкладаў работы палітасветных устаноў на вёсцы можна прывесці нямала. У палескай вёсцы Рылавічы, Даманавіцкага раёна, калгасны клуб з'яўляецца гордасцю калгаснікаў. У клубе можна ва ўтульнай абстаноўцы пачытаць газету, кнігу, паслухаць даклад або радыёперадачу. Сем рознастайных гурткоў, арганізаваных пры клубе, прыцягнулі да сябе не толькі моладзь, але і старыкоў. У вольны час тут ёсць куды пайсці калгаснику.

Або возьмем клуб калгаса «Чырвоны будаўнік», Камарынскага раёна. Яго вагадчык комуніст тав. Цярэшчанка згрупаваў вакол сябе шырокі актыў. У клубнай бібліятэцы ёсць некалькі тысяч кніг. У чытальні сістэматычна праводзяцца гутаркі на тэмы, хвалюючыя калгаснікаў. Працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці. Клуб стаў сапраўдным цэнтрам культуры, да якога цягнецца пераважная большасць насельніцтва калгаса.

З надыходам асенне-зімовага перыяду работа палітасветных устаноў на вёсцы павінна асабліва ажывіцца. У кожнага калгасніка ёсць больш вольнага часу, чым было ў перыяд гарачых палявых работ. Гэты час ён жадае правесці з найбольшай карысцю. Сёнешні калгаснік ужо не абмяжоўваецца чытаннем газеты або кнігі, узятай з бібліятэкі. У яго вялікі круг запатрабаванняў: ён жадае наведваць агульнаадукацыйную школу, слухаць лекцыі прыезджых навуковых работнікаў, глядзець навінкі совецкай кінематаграфіі, мець пад рукамі кнігі класічнай і сучаснай літаратуры, выяўляць свае здольнасці ў гуртках мастацкай самадзейнасці.

Гэтыя запатрабаванні зусім натуральныя, і выкананне іх магчыма ва ўмовах любога калгаса. Справа залежыць толькі ад таго, як пастаўлена работа Дома соцыялістычнай культуры, клуба, хаты-чытальні, як арганізуе іх работу партыйна-комсамольская арганізацыя, як забяспечана кіраўніцтва імі з боку органаў народнай асветы.

Між тым, можна прама сказаць, што ўвага да работы палітасветных устаноў на месцах яшчэ вельмі і вельмі недастатковая. Асабліва гэта датычыць раённых і сельсовецкіх дамоў соцыялістычнай культуры, падпараджаваных сістэме Наркамасветы БССР.

Найбольш надзённым пытаннем тут з'яўляецца падбор кадраў. Марудная падрыхтоўка кадраў для палітасветных устаноў з боку Наркамасветы БССР, частае скарыстоўванне гэтых кадраў не па прызначэнню вядзе да таго, што дамы соцыялістычнай культуры астаюцца без падрыхтаваных загадчыкаў. У раёнах-жа дагэтуль існуе шкодная думка, што загадчыкам палітасветнай установы можа быць любы таварыш, незалежна ад яго агульнай падрыхтоўкі і арганізатарскіх здольнасцей.

Аддзел палітасветных устаноў Наркамасветы БССР дагэтуль нічога істотнага не зрабіў, каб забяспечыць наяўную сетку дамоў соцыялістычнай культуры, клубаў, хат-чыталень адпаведнымі кадрамі, сваёй штодзённай дапамогай і аператыўным, чоткім кіраўніцтвам. З раёнаў рэспублікі і пяшер не змяншаецца прыток сігналаў аб дрэннай рабоце многіх палітасветных устаноў, аб недаацэнцы іх значэння мясцовымі кіруючымі арганізацыямі. Такія сігналы мы маем з Горацкага, Жлобінскага, Парыцкага і ряду іншых раёнаў. Відавочна, што вынікі шкодніцкай дзейнасці, якая праводзілася выкрытымі ворагамі народа на культурна-асветным фронце, яшчэ дзеніздзе далёка не поўнасцю ліквідаваны. Да работы-ж палітасветных устаноў павінна быць прыкавана максімум увагі партыйна-комсамольскіх арганізацый.

Набліжаюцца дзве знамянальныя даты ў жыцці нашай радзімы — XX гадавіна ленінска-сталінскага комсамола і XXI гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. У падрыхтоўцы да гэтых юбілеяў значная роля адведзена палітасветным установам. Яны з'яўляюцца цэнтрамі агітацыйна-прапагандысцкай работы. Вакол іх групуецца калгасная мастацкая самадзейнасць, якая рыхтуе да святочных урачыстых вечароў цікавыя пастаноўкі, песні, танцы, музычныя нумары. На алімпіядах народнай мастацкай самадзейнасці, якія зараз праводзяцца на ўсіх абласцях рэспублікі, гурткі мастацкай самадзейнасці пакажуць сваю работу, перададуць свой вопыт іншым. Неабходна, каб работа, разгорнутая ў дамах соцыялістычнай культуры, калгасных клубах, хатах-чытальнях у сувязі з падрыхтоўкай да свят, была замацавана на ўвесь час.

Вялікія магчымасці адкрыты для работы палітасветных устаноў на вёсцы ў асенне-зімовы перыяд. Неабходна толькі, каб яны былі забяспечаны штодзённым кіраўніцтвам і ўвагаю партыйна-комсамольскіх арганізацый. Загадзя павінны быць упарадкаваны клубныя памяшканні і забяспечаны ўсім неабходным для правядзення шырокай культурна-масавай работы. У кожным калгасным клубе і хаце-чытальні неабходна стварыць такую абстаноўку, каб яна штовечар вабіла калгаснікаў. Работай рознастайных гурткоў, сістэматычным правядзеннем гутарак, дакладаў, вечароў мастацкай самадзейнасці кожная палітасветная ўстанова прыцягне да сябе ўвагу калгаснікаў, заслужыць пашану і аўтарытэт.

Для правядзення-ж гэтай работы на месцы можна знайсці выдатныя сілы. Амаль кожны калгас мае шырокі актыў з перадавых калгаснікаў, комсамольцаў і несаюзнай моладзі. У работу палітасветных устаноў павінна быць уцягнута мясцовая інтэлігенцыя — настаўнікі, аграномы, урачы. Ды і сярод радавых калгаснікаў нямала знойдзецца здольных арганізатараў, масавікоў, аматараў мастацкай самадзейнасці. Задача заключаецца толькі ў выяўленні і арганізацыі іх.

Скора надыйдзе зіма. У доўгія зімовыя вечары і выходныя дні найлепшым месцам правядзення часу калгаснікаў будзе клуб, хата-чытальня. Іменна тут будзе сканцэнтравана культурна-масавая і палітыка-выхаваўчая работа. Задача партыйных і комсамольскіх арганізацый — зрабіць кожны клуб, кожны Дом соцыялістычнай культуры, кожную хату-чытальню сапраўдным цэнтрам палітмасавай работы, сапраўдным культурным ачагом калгаснай вёскі.

Становішча ў Чэхаславакіі

ПРАВАКАЦЫІ ВЕНГЕРСКІХ ФАШЫСТАЎ

ПРАГА, 23 кастрычніка. (БЕЛТА). Учора венгерскаму пасланніку ў Празе была перадана нота чэхаславацкага ўрада, якая прапануе аднавіць перагаворы, спыненыя тыдзень таму назад па ініцыятыве венгерскай дэлегацыі. Нота была зараз-жа перадана ў Будапешт. Адказу венгерскага ўрада яшчэ няма.

Мінулай ноччу на чэхаславацка-венгерскай граніцы зноў адбыліся крывавыя сутычкі. Банда венгерскіх тэрарыстаў уварвалася на тэрыторыю Паўднёвай Славакіі. Адбылася перастрэлка паміж часцямі чэхаславацкай арміі і тэрарыстамі, у рэзультаце якой забіта 13 тэрарыстаў і 12 ранена. На баку чэхаславакаў забіт 1 і ранены 3 чалавекі. У паўднёвай частцы Закарпацкай Украіны банда венгерскіх тэрарыстаў напала на мытны пост. Нападаўшыя захоплены ў палон, сярод іх — старшы лейтэнант венгерскай арміі. К 23 кастрычніка ўся тэрыторыя Славакіі і Закарпацкай Украіны была ачышчана ад венгерскіх налётчыкаў.

Рэакцыйныя мерапрыемствы славацкага ўрада

ПРАГА, 22 кастрычніка (БЕЛТА). З Славакіі паведамляюць аб новых рэакцыйных мерапрыемствах аўтаномнага славацкага ўрада. Рыхтуецца законапраект антысеміцкага характару, які прадугледжвае неадкладнае высяленне з Славакіі 40.000 яўрэяў, пасяліўшыхся ў вобласці за апошнія годы. Ва ўноў адкрываючыйся ў Братыславе славацкі універсітэт прыём асоб яўрэйскай нацыянальнасці будзе афіцыяльна забаронен. У публікуемай журналам «Наступ» (орган славацкай аўтаномнай моладзі) праграме «стварэння аўтаномнай Славакіі» высоўваюцца наступныя патрабаванні:

1. Звальненне і высылка з межаў Славакіі ўсіх служачых чэшскай нацыянальнасці;

2. Высяленне ўсіх яўрэяў, якія пасяліліся ў Славакіі пасля 1918 года;

3. Канфіскацыя ўладанняў, набытых чэхамі ў рэзультаце рэформы 1918 года.

Устаноўлена жорсткая цэнзура ўсіх органаў друку.

Распараджэнне Фрыка

ПРАГА, 23 кастрычніка. (БЕЛТА). Паводле распараджэння германскага міністра ўнутраных спраў Фрыка, у акупіраваных раёнах Судэцкай вобласці арганізоўваюцца 4 паліцэйскія ўпраўленні і 4 самастойныя ўпраўленні Гестапо (у гарадах Рэйхенбергу, Тропаў, Аусіг і Карлсбадзе). Начальнікі ўпраўленняў прызначаюцца са складу работнікаў цэнтральнага ўпраўлення Гестапо.

Высылка чэшскага насельніцтва з Цешынскай Сілезіі

ПРАГА, 23 кастрычніка. (БЕЛТА). Ваенны губернатар акупіраванага польскімі войскамі Цешынскага раёна генерал Бартноўскі выдаў загад, паводле якога тры тысячы жывучых у раёне чэхаў павінны не пазней 1 лістапада выехаць у Чэхаславакію. Гэта распараджэнне выклікала велізарнае абурэнне ўсяго мясцовага насельніцтва.

УЗМАЦНЕННЕ БЛАКАДЫ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ІСПАНІІ

ЛОНДАН, 22 кастрычніка. (БЕЛТА). У палітычных кругах Лондана ўказваюць, што Чэмберлен узяў на сябе абавязацельства перад італьянскім урадам правесці зацвярджэнне англа-італьянскага пагаднення ў парламенце, хоць, як паведамлялася ўжо, англійскі кабінет фармальна яшчэ і не адобрыў гэта пагаднення.

Па паведамленню дыпламатычнага аглядальніка газеты «Дэйлі уоркер», Чэмберлен прыпоў да гэтага рашэння пасля атрымання даклада фельдмаршала Чэтвуда аб яго паездцы ў Іспанію ў якасці старшыні англійскай камісіі па абмену ваеннапалоннымі. Чэтвуд прыйшоў да заключэння, што іспанская рэспубліканская армія значна мацней арміі іспанскіх мяцежнікаў і што для правядзення якіх-небудзь сур'ёзных аперацый генералу Франко неабходна дадаткова яшчэ 100 тыс. добра абучаных замежных салдат.

Чэмберлен пры гэтым разлічвае, піша аглядальнік, што блакада Іспанскай рэспублікі, якую італьянскі і германскі флоты змогуць прадаўжаць пад сцягам Франко пасля ратыфікацыі англа-італьянскага пагаднення, можа ў некаторай меры кампенсаваць недахват замежных салдат на старане мяцежнікаў.

Камітэт «Міжнароднага руху за мір» у паведамленні для друку папярэдзіў грамадскую думку аб падрыхтоўцы падобнага манеўра з боку Чэмберлена. Камітэт патрабуе адклікання ўсіх германа-італьянскіх войск з Іспаніі.

12 лістапада ў Лондане склікаецца нацыянальная канферэнцыя арганізацыі «Міжнароднага руху за мір» для абмеркавання гэтага пытання.

***

ПАРЫЖ, 23 кастрычніка. (БЕЛТА). Газета «Матэн» друкуе тэлеграму з Лондана, у якой паведамляецца, што італа-англійскі дагавор ад 16 красавіка будзе ратыфікаван Англіяй у пачатку лістапада. Па словах газеты, Англія прызнае італьянскія заваёвы ў Абісініі, а таксама права ваюючага боку за іспанскімі фашысцкімі мяцежнікамі.

ПАГОРШАННЕ ХАРЧОВАГА СТАНОВІШЧА Ў ГЕРМАНІІ

НЬЮ-ЕРК, 23 кастрычніка. (БЕЛТА). Нядаўна амерыканская газета «Дэйлі уоркер» змясціла пісьмо з Берліна аб харчовым становішчы Германіі.

За пяць год фашысцкага рэжыма ў Германіі жыццёвы ўзровень насельніцтва рэзка знізіўся. Працоўныя масы даўно адчулі, што азначае на практыцы праславуты лозунг «гарматы замест масла». Справа дайшла да таго, што замест ялавічыны ў апошні час на рынках Германіі паявіўся новы «прадукт харчавання» — мяса сабак.

Згодна афіцыяльных даных германскага статыстычнага бюро, спажыванне ў краіне такіх прадуктаў, як сала, кабаніна, малако, сыр, чай, кофе, рэзка знізілася. Мізэрныя заработкі працоўных у Германіі прымушаюць іх жыць упрогалаўзь, адмаўляць сабе нават у хлебе. Германская статыстыка адзначае, што за гады фашысцкага гаспадарання ў краіне спажыванне хлеба знізілася на 30 проц.

Апрача таго, хлеб гэты па сваёй якасці вельмі дрэнны і мае ў сабе розныя прымешкі, у тым ліку і хімічныя. Спажыванне такога хлеба прыводзіць да масавых атручванняў і страўнікавых захворванняў.

Цікава адзначыць, што гітлераўскія прапагандысты, якія імянуюць сябе «вучонымі», даказваюць, што хлеб, выпякаемы з пшанічнай мукі, з'яўляецца «выдумкай лібералаў» і што «хлеб з хімічнымі прымешкамі значна лепш усвайваецца арганізмам, чым пшанічны хлеб, малако, масла і яйкі».

Харчовыя затрудненні ў «Трэцяй імперыі» настолькі абвастрыліся, што нават самі фашысты ўжо не могуць утойваць ад грамадскасці факты сістэматычнага зніжэння спажывання ў Германіі. У святле гэтых даных робіцца ясным кожнаму, што гітлераўская авантурысцкая палітыка ажыццяўляецца за кошт зніжэння жыццёвага ўзроўню шматмільённага насельніцтва Германіі.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

Японскія войскі, авалодаўшы Шыхуайяо, на паўднёвым беразе ракі Янцзы (за 120 кілометраў на паўднёвы ўсход ад Ханькоу), вядуць узмоцненыя атакі на горад Дае (на поўдзень ад Хуанчжоу). У гэтым раёне ідуць жорсткія баі.

У ПАУДНЁВЫМ КІТАІ

Паводле вестак, 20 кастрычніка жорсткія баі праходзілі ў непасрэднай блізасці ад Кантона. Пусціўшы ў ход механізаваныя часці і цяжкую артылерыю, японцы прарвалі кітайскую лінію абароны і падышлі да ўскраін горада. Следам за механізаванымі часцямі прасоўваецца японская пяхота. Японская авіяцыя няспынна бамбардыруе ўсе населеныя пункты вакол Кантона і чыгункі. 21 кастрычніка баі разгарнуліся на ўсходніх ускраінах Кантона.

Эвакуацыя насельніцтва з горада прадаўжаецца. Усе ўстановы пераведзены ў іншыя пункты правінцыі. Кітайскія войскі будуюць новую лінію абароны на захад і поўнач ад Кантона.

У ПАУНОЧНЫМ КІТАІ

Горад Цзіюань (паўночна-заходняя частка правінцыі Хэнань) узят кітайскімі войскамі. Кітайцы авалодалі вялікімі трафеямі. Буйныя баі прадаўжаюцца на ўсход ад гэтага горада.

Комсамольцы-стаханаўцы менскай шчотачнай фабрыкі імя Крупскай сустракаюць XX гадавіну ВЛКСМ і XXI гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі перавыкананнем сваіх вытворчых норм. НА ЗДЫМКУ: група комсамольцаў-стаханаўцаў (злева направа)—першы рад: тт. С. К. Занеўскі, Л. А. Наўроцкая; другі рад: Л. С. Салавей, А. Ф. Бенькоўскі і М. Л. Голуб, якія у 2 разы перавыконваюць свае вытворчыя заданні.

Фото С. Грыпа.

У СОВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР

Аб незаконнай арганізацыі пры калгасах прамысловых прадпрыемстваў, не звязаных з сельскагаспадарчай вытворчасцю

У радзе раёнаў арганізаваны пры калгасах прамысловыя прадпрыемствы, не звязаныя з сельскай гаспадаркай. Так, некаторыя калгасы Бела-Калітвенскага раёна, Растоўскай вобласці («Новая жизнь», «Гремучий ключ», «Северный Кавказ» і іншыя) заняліся прамысловай здабычай вугалю. На калгасных шахтах гэтага раёна занята 273 наёмных рабочых. У асобных калгасах Падольскага раёна, Маскоўскай вобласці (калгасы «Ям», «Лукинский» і інш.) і Паргалаўскага раёна, Ленінградскай вобласці («Вперед», «2-е Парголово») арганізаваны розныя прадпрыемствы, не звязаныя з сельскай гаспадаркай, як, натрыклад, фарбацёрачная вытворчасць, электрамантажная майстэрня і т. п.

Падобныя-ж факты арганізацыі пры калгасах прамысловых прадпрыемстваў, не звязаных з сельскай гаспадаркай, маюць месца таксама і ў радзе раёнаў іншых абласцей.

У некаторых выпадках страты, якія церпяць калгасы ад арганізаваных імі прамысловых прадпрыемстваў, перавышаюць гадавы даход калгаса ад сельскай гаспадаркі. Праўленні калгасаў пакрываюць гэтыя страты за кошт даходаў, якія прылічваюцца калгаснікам за працадні, выпрацаваныя імі на сельскагаспадарчых работах.

Совет Народных Камісараў СССР устанавіў, што арганізацыя пры калгасах прамысловых прадпрыемстваў, не звязаных з сельскай гаспадаркай, супярэчыць статуту сельскагаспадарчай арцелі, а арганізацыя прамысловай здабычы вугалю ў калгасах з'яўляецца, апрача таго, і прамым парушэннем Канстытуцыі (асноўнага закона) Саюза ССР, згодна якой нетры зямлі з'яўляюцца дзяржаўнай уласнасцю.

У рэзультаце гэтых незаконных дзеянняў, зробленых пры патуранні з боку мясцовых совецкіх арганізацый, наносіцца прамая шкода калгаснікам, змяншаюцца іх даходы, размяркоўваемыя па працаднях.

Лічачы неабходным спыніць гэту процідзяржаўную і пракалгасную практыку, Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанавіў:

1. Ліквідаваць у калгасах прамысловыя прадпрыемствы, не звязаныя з сельскагаспадарчай вытворчасцю, як арганізаваныя ў парушэнне статута сельскагаспадарчай арцелі;

2. Устанавіць, што прамысловыя прадпрыемствы калгасаў, ліквідуемыя на падставе гэтай пастановы, перадаюцца раённымі выканаўчымі камітэтамі ў распараджэнне мясцовых дзяржаўных і кааператыўных арганізацый;

3. Даручыць пракурору СССР расследаваць факты незаконнай арганізацыі пры калгасах прамысловых прадпрыемстваў, не звязаных з сельскагаспадарчай вытворчасцю, і прыцягнуць вінаватых да адказнасці.

АДКРЫЛАСЯ АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ МЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

ПАКАЗ НАРОДНЫХ ТАЛЕНТАЎ

На першую абласную алімпіяду мастацкай самадзейнасці, якая прысвячаецца XX-годдзю ленінска-сталінскага комсамола і XXI гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, сабраліся лепшыя мастацкія калектывы і асобныя выканаўцы 23 раёнаў Менскай вобласці.

900 чалавек розных узростаў, прафесій і родаў заняткаў прыехалі прадэманстраваць свае мастацкія здольнасці, паказаць свае таленты, якіх у народзе непачаты край.

Сакратар Менскага абласнога камітэта КП(б)Б тав. Абушэнка ад імя большэвікоў Менскай вобласці віталя ўдзельнікаў алімпіяды.

Праграму алімпіяды адкрыў хор калгаснікаў Селенжаўскага сельсовета, Чырвонаслабодскага раёна, пад кіраўніцтвам маладога калгасніка тав. Серады. У рэпертуары хора рознастайныя народныя песні, пачынаючы ад мілагучнай народнай грузінскай песні «Суліко» і канчаючы яўрэйскай песняй «Біраб'джан» і «Пролетарыер швестэр майнэ» (апошняя — сола ў выкананні тав. Серады).

З чытаннем сваіх вершаў выступіў рабочы соўгаса «Новыя Зялянкі», Чэрвеньскага раёна, бясспрэчна таленавіты, пачынаючы паэт тав. Жэнчак.

Бурнае адабрэнне прысутных выклікалі жыццерадасныя, развесяліўшыя ўсю аўдыторыю, выступленні танцавальнага калектыва рудзенскай торфарцелі імя 16 партызан. Танцоры гэтага ансамбля тт. Чахоўская і Сезэнь, літаральна за 15—20 мінут авалодалі ўсеагульнай сімпатыяй залы.

Не меншым поспехам карыстаўся самадзейны квартэт сям'і 70-гадовага калгасніка Нікалая Мопіча з калгаса «Першая пяцігодка», Нашкага сельсовета, Крупскага раёна, які выканаў рад беларускіх народных песень.

Як адзін з лепшых калектываў, прадстаўленых на алімпіядзе, неабходна адзначыць выступленне самадзейнікаў пухавіцкай арцелі швейнікаў (тав. Аўсянікаў—сола, спевы, вакальны квартэт у складзе тт. Аўсянікава, Езубчыка, Дуброўскага і Ерашэвіча).

Апрача вышэйпамянёных калектываў, у першым прагляде прынялі ўдзел калектывы Копыля і іншых раёнаў.

***

Асабліва неабходна адзначыць далёка не бліскучую арганізацыю першага дня паказу.

Незразумела, чаму кіраўнікі алімпіяды ўзялі курс на абавязковы прагляд амаль усіх нумароў, якія ёсць у рэпертуары таго ці іншага калектыва. Такая ўстаноўка празмерна стамляе ўдзельнікаў і, бясспрэчна, адбіваецца на якасці паказу.

Алімпіяда не павінна ставіць перад сабой мэты арганізацыі вычарпальных канцэртаў усіх мастацкіх калектываў, якія на ёй прадстаўлены. Для адборачных прагляда неабходна паказваць толькі лепшыя нумары, якія ёсць у рэпертуары калектываў і асобных выканаўцаў.

Г. ТАРАН.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ

ВЫБАРЫ КІРУЮЧЫХ КОМСАМОЛЬСКІХ ОРГАНАЎ.

НА ВЫСОКІМ ІДЭЙНЫМ УЗРОЎНІ

ВІЦЕБСК. 20 і 21 кастрычніка праходзіў справаздачна-выбарчы сход комсамольскай арганізацыі вітебскага станкабудаўнічага завода імя Кірава.

За справаздачны перыяд комсамольскі калектыў завода правёў вялікую работу па ачышчэнню сваіх радоў ад варожых элементаў. Да справаздачна-выбарчага схода комсамольцы завода прышлі дружным калектывам, цесна згуртаваным вакол партыі Леніна — Сталіна.

Свой даклад сакратар камітэта тав. Рутэнберг пабудаваў на цікавых фактах з жыцця арганізацыі на працягу года. Гаворачы аб авангардная ролі комсамольцаў на вытворчасці, тав. Рутэнберг паказаў рост аўтарытэта комсамольцаў у цэхах. Усе 62 комсамольцы, працуючыя ля станка, — стахановцы. Многія з іх — трохсотнікі і двухсотнікі. Комсамолец Чарноўскі выконвае вытворчую праграму на 325 процантаў, Гіндзін — на 350 проц., Генін — на 213 проц. і т. д.

Рыхтуючыся да слаўнага юбілею ВЛКСМ, комсамольцы з'явіліся ініцыятарамі спаборніцтва, якім ахоплена амаль уся моладзь завода. У спаборніцтва ўключылася не толькі моладзь, але і старыя рабочыя.

— Аднак з моладдзю мы працавалі яшчэ недастаткова, — гаворыць тав. Рутэнберг. — Гэта адбілася на росце арганізацыі.

За год мы выраслі толькі на 44 чалавекі, а моладзі на заводзе — 115 чалавек.

У час выбараў у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР больш 30 комсамольцаў працавалі на выбарчых участках агітатарамі і членамі выбарчых камісій.

Ідэйна выраслі комсамольцы. 15 чалавек рэкамендаваў камітэт для ўступлення ў кандыдаты партыі. 10 з іх прынятыя.

Другую частку даклада тав. Рутэнберг прысвяціў абароннай рабоце. На заводзе ёсць свае лётчыкі, парашутысты, снайперы, усе яны—комсамольцы. Увесь рабочы калектыў завода ведае снайпера-комсамольца т. Асталенку, які з'яўляецца інструктарам стралковага спорта. На гарадскіх стралковых спаборніцтвах каманда завода заняла першае месца. Не меншай папулярнасцю карыстаюцца сярод рабочых лётчыкі-безадрыўнікі: Сайко, Баскін, браты Баранавы. Але і ў абароннай рабоце ёсць рад недахопаў. З 250 маладых рабочых членамі АСО з'яўляюцца толькі 42 чалавекі.

На высокім ідэйным узроўні праходзілі спрэчкі па справаздачы камітэта. Комсамольцы па-дзелавому абмяркоўвалі работу, рэзка крытыкуючы недахопы, адзначалі і добрыя бакі. Выступіўшы ў спрэчках член партыі тав. Кароткі сказаў:

— Комсамольская арганізацыя завода добра паказала сябе на вытворчасці. Рэзультаты яе работы бачны. У спаборніцтве да XX гадавіны комсамола 100 маладых рабочых сталі стахановцамі. Вялікую дапамогу ў развіцці стахановскага руху аказалі нарады маладых стахановцаў.

Выступіўшы ў спрэчках комсамольцы тт. Груднік, Мільяненка, Фішкін і іншыя ўказалі, што камітэт недастаткова працаваў з прапагандыстамі і агітатарамі, не правяраў іх работы. Захапіўшыся колькасным ахопам комсамольцаў вучобай, камітэт не звяртаў увагі на яе якасць. Комсамолец Керпелеў зусім грунтоўна крытыкаваў камітэт за слабую работу з тэхнічнай інтэлігенцыяй—моладдзю.

— У нас забыліся аб існаванні маладых інжынераў і тэхнікаў, — гаворыць тав Керпелеў. — а іх можна было уцягнуць у актыўную работу, зрабіць з іх добрых прапагандыстаў і агітатараў

Усяго ў спрэчках выступіла 25 чалавек з 60 прысутнічаючых. Арганізавана прайшло намячэнне кандыдатур у новы састаў камітэта, у які ўвайшлі лепшыя таварышы, праявіўшыя сябе на практычнай рабоце ў комсамольскай арганізацыі.

Дакладчыкі, прапагандысты і бяседчыкі па пытанню аб XXI гадавіне Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі слухаюць інструкцыйны даклад у менскім Доме партактыва. Фото Я. Салавейчыка.

САМАСТОЙНА АВАЛОДВАЦЬ МАРКСІЗМАМ-ЛЕНІНІЗМАМ

Выхад у свет Кароткага курса гісторыі ВКП(б) з'яўляецца сусветна-гістарычнай падзеяй Новы падручнік па гісторыі партыі — гэта выдатны дакумент нашай партыі, які натхняе кожнага комуніста, совецкую інтэлігенцыю, працоўных нашай краіны на далейшую барацьбу за перамогі социялізма, уэнімае іх палітычную актыўнасць.

Як толькі газета «Правда» пачала друкаваць Кароткі курс гісторыі ВКП(б), комуністы, комсамольцы, совецкая інтэлігенцыя нашага раёна з вялікай любоўю прыступілі да індывідуальнага азнаямлення са слаўнымі старонкамі гісторыі большэвізма.

Каб глыбока вывучыць гісторыю партыі, каб авалодаць тэорыяй марксізма-ленінізма, кожнаму комуністу неабходна самастойная, глыбокая работа над кнігай, над Кароткім курсам гісторыі ВКП(б). Сур'ёзная, індывідуальная работа над тэорыяй Маркса—Энгельса — Леніна—Сталіна павінна стаць галоўнай формай у партыйнай вучобе.

Коратка я хачу падзяліцца вопытам індывідуальнай вучобы, вопытам работы над кнігамі класікаў марксізма-ленінізма. У пачатку работы прапагандыстам я адчуваў сябе вельмі непадрыхтаваным Меў нізкі агульнаадукацыйны ўзровень. Спецыяльнай палітычнай падрыхтоўкі таксама не было.

Мне неабходна было ўпарта вучыцца, авалодваць марксізмам-ленінізмам. Гэта задача ў асноўным ужо вырашана. На працягу пяці год я вучыўся ў вячэрніх школах, завочна. Упарта самастойна працаваў над кнігамі Кожны дзень чытаў мастацкую і тэхнічную літаратуру Безумоўна, было цяжка спалучыць практычную работу з вучобай Аднак, зараз я па агульнаадукацыйных прадметах маю асвету за дзесяцігодку Заканчваю другі курс завочнага Маскоўскага інстытута гісторыі і філасофіі. Па ўсіх прадметах залікі здаю на выдатна і добра.

Многія комуністы скардзяцца на недахват вольнага часу. Гэта няправільна. Кожны дзень можна знайсці некалькі гадзін для індывідуальнай вучобы. Патрэбна толькі ўмець увязваць вучобу з выкананнем даручэнняў партыйных і совецкіх арганізацый.

Каб павысіць свой ідэйна-палітычны ўзровень, я чытаў творы Маркса—Энгельса — Леніна — Сталіна Прачытанае запісваю ў канспект. З незразумелымі пытаннямі зварачаюся да больш падрыхтаваных таварышоў і кожны раз сумеснымі сіламі іх вырашаем. Я заканспектаваў творы Леніна «Развіццё капіталізма ў Расіі», «Дзяржава і рэволюцыя», «Дзве тактыкі» і інш.; творы Маркса «Крытыка Гоцкай праграмы», асобныя раздзелы «Капітала», у другі раз глыбока вывучаю выдатную тэарэтычную працу таварыша Сталіна «Пытанні ленінізма».

Наша партыя атрымала выдатны тэарэтычны твор—«Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». На слаўных старонках барацьбы і перамог партыі Леніна — Сталіна будуць выхоўвацца нашы кадры, совецкая інтэлігенцыя. Асноўнай формай вучобы павінна быць індывідуальная работа комуністаў над кнігай, у гэтым я сам пераканаўся на вопыце. Заняткі ў гуртках многім комуністам асабліва падрыхтаваным, перашкаджалі ўзнімаць свае веды, самастойна авалодваць тэорыяй марксізма-ленінізма.

Задача партыйных арганізацый—стварыць усе ўмовы для індывідуальнай вучобы комуністаў і совецкай інтэлігенцыі. Кожны комуніст павінен вывучаць гісторыю ВКП(б) самастойна, упарта працуючы над кнігамі, смела авалодваючы тэорыяй марксізма-ленінізма.

Ф. Ф. ЕРЭМУХІН,
прапагандыст Смалявіцкага раёна.

НА КАМСАМОЛЬСКІХ СХОДАХ ПАЛЕССЯ

МОЗЫР. (**Кар. «Звязды»**). На прадпрыемствах, у калгасах і ўстановах Палескай вобласці праходзяць справаздачна-выбарчыя комсамольскія сходы.

Сакратар комсамольскага камітэта мазырскай фабрыкі «Комінтэрн» тав. Рудкоўскі зрабіў змястоўны даклад Арганізацыя правяла вялікую работу па ачышчэнню сваіх радоў ад варожых і разлажыўшыхся элементаў. За 9 месяцаў арганізацыя вырасла за лік стахановцаў і лепшай перадавой моладзі.

Да 20-годдзя ленінска-сталінскага комсамола падрыхтоўваецца 11 значкістаў па абароннай справе, з якіх 10 ужо здалі нормы. У гуртку ГПА займаецца 25 чалавек. Комсамольцы рыхтуюць дастойныя падарункі маперадзіме. Тт. Лейфман, Галавач выконваюць вытворчы план выконваюць больш чым на 200 процантаў.

На справаздачна-выбарчым сходзе КСМ арганізацыі завода «Чырвоны Кастрычнік» у спрэчках выступіла 19 комсамольцаў. Яны крытыкавалі парочны стыль работы былога сакратара комсамольскага камітэта Зялёнкі, які адарваўся ад жыцця і работы комсамольскай арганізацыі. У дакладзе Зялёнка нават ні словам не абмовіўся аб падрыхтоўцы да XX гадавіны ВЛКСМ

На сходзе адной з буйнейшых у вобласці калгаснай комсамольскай арганізацыі сельгасарцелі імя Варашылава. Мазырскага раёна, выявілася слабае кіраўніцтва і дапамога райкома і абкома комсамола сельскім пярвічным арганізацыям. Вельмі часта мяняліся прапагандысты, зрывалася палітвучоба. Новапрынятыя комсамольцы Бобр Анна, Кузьменка Сафрон з мая абіваюць парогі райкома комсамола і ніяк не могуць атрымаць білеты. У жніўні абком комсамола заслухаў справаздачу арганізацыі гэтага калгаса, а рашэнне выслаў толькі ў кастрычніку. Гэта гаворыць аб тым, што Палескі абком комсамола слаба дапамагае сельскім пярвічным комсамольскім арганізацыям.

С. БАЧУРА.

ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

СПАБОРНІЦТВА НАЧАЛЬНІКАЎ ЦЭХАЎ І БРЫГАДЗІРАЎ

ГОМЕЛЬ. (**Кар. «Звязды»**). Ініцыятар перадкастрычніцкага спаборніцтва па Гомельскай вобласці — рабочы калектыў друкарні «Палесдрук» высока трымае пераходны чырвоны сцяг перадавога прадпрыемства паліграфічнай прамысловасці, фабрыка не здае пяршынства па тэмпах і якасці прадукцыі.

Па ініцыятыве перадавых камандзіраў вытворчасці — начальнікаў цэхаў Тарасевіча, Раманоўскай, Лейбовіча і іншых на фабрыцы разгорнута спаборніцтва паміж начальнікамі цэхаў і брыгадзірамі на дастойную сустрэчу слаўнай гадавіны Вялікага Кастрычніка. На чале сваіх калектываў, у дружнай працы, камандзіры вытворчасці змагаюцца за датэрміновае выкананне плана 1938 г. і большэвіцкую падрыхтоўку да новага 1939 гаспадарчага года. Начальнікі цэхаў і брыгадзіры абавязаліся перавыканаць план выпуску прадукцыі па асартыменту, ліквідаваць брак, знізіць сабекошт супроць плана на 2 проц., узняць прадукцыйнасць працы на 5 проц. звыш прадугледжанай планам, сістэматычна ўносіць рацыяналізатарскія прапановы, дабіцца эканоміі ў расходванні сыравіны, узорнай арганізацыі тэхнічнай вучобы і т. д.

22 кастрычніка вышаў спецыяльны нумар фабрычнай шматтыражкі «Ратацыя», дзе надрукаваны ўмовы социялістычнага спаборніцтва, а таксама перадавыя начальнікі цэхаў—Раманоўская (начальнік наборнага цэха), Тарасевіч (пераплётнага), Волкінд (друкарскага)—дзеляцца вопытам арганізацыі социялістычнага спаборніцтва ў цэхах.

Фабрыка «Палесдрук» датэрмінова выканала 10-месячную вытворчую праграму.

***

ГОМЕЛЬ. (**Кар. «Звязды»**). Газета «Железнодорожник Белоруссии», орган упраўлення і палітаддзела Беларускай чыгункі, праводзіць каштоўнае і важнае мерапрыемства.

Сістэматычна на старонках газеты друкуецца матэрыял пад рубрыкай «Стахановская школа». Лепшыя людзі чыгункі, ініцыятары стахановска-крывоносаўскай работы на транспарце, расказваюць аб вопыце сваёй работы.

15 кастрычніка ў газеце была надрукавана лекцыя стахановца станцыі Гомель саставіцеля В. Ф. Міхалюта і старшага манеўровага машыніста Д. І. Паповіча аб стахановскім вопыце фарміравання паязздоў. На двух газетных палосах шырока перадаецца вопыт стахановскай работы. Лекцыя суправаджаецца дыяграмамі і табліцамі.

Для дапамогі стахановцам прыцягнуты лепшыя тэхнічныя сілы чыгункі. Лекцыі тт. Міхалюта і Паповіча рэдагуе і каментыруе інжынер Сцепановіч.

Н. ГІРШЫН.

ВЫКАНАЛІ МЕСЯЧНЫ ПЛАН

Спаборнічаючы за дастойную сустрэчу XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі, стахановцы менскага вагонарамонтнага завода імя Мяснікова дабіліся высокіх паказальнікаў социялістычнай прадукцыйнасці працы.

Працуючы на абточны калёсных пар, стахановец-токар калёснага цэха тав Мезін 16 кастрычніка закончыў выкананне кастрычніцкага плана, ім абточана 75 калёсных пар і 25 калец. План выканан на 229 проц.

Стахановец-токар тав. Глінскі, які ўстанавіў рэкорд абточкі калёсных пар у цэху (ён абтачыў 7 калёсных пар замест 3 па плану), дабіўся яшчэ больш высокіх паказальнікаў і абтачвае па 8 калёсных пар. План тав. Глінскі за 13 дзён кастрычніка выканаў на 221 процант. Тав. Глінскі перадае свой вопыт работы вучням-токарам. На сходзе рабочых цэха ён расказаў, як дабіўся поспехаў у рабоце.

Тав Леля — свярлільшчык механічнага цэха—устанавіў рэкорд свярлоўкі адтулін да нацяжных балтоў падвесных рэсор Пры норме за 7 гадзін прасвярліць 20 нацяжных балтоў тав. Леля прасвярліў 82 штукі, план выканаў на 410 процантаў

Рамантуючы падвесныя рэсоры, 17 кастрычніка рэсоршчык тав. Мішын выканаў план на 420 процантаў.

Дастойную сустрэчу рыхтуюць стахановцы завода вялікаму святу працоўных.

А. ПЯТРОЎ.

ВЕТЭРЫНАРНЫЯ РАБОТНІКІ ЎКЛЮЧАЮЦЦА Ў СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ПА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

Гэтымі днямі пры ЦК КП(б)Б адбылася ўсебеларуская нарада ветэрынарных работнікаў з удзелам старшынь РВК і загадчыкаў райземаддзеламі 16 раёнаў Нарада намеціла канкрэтныя мерапрыемствы па канчатковай ліквідацыі інфекцыйных захворванняў конскага пагалоўя (анеміяй, сапам і т. д.) і ўсяго пагалоўя жывёлы.

Уключаючыся ў спаборніцтва за норы ўздым социялістычнай жывёлагадоўлі, удзельнікі нарады ў прынятым звароце да ўсіх калгаснікаў, калгасніц і спецыялістаў пішуць:

...«Таварышы калгаснікі, работнікі жывёлагадоўлі, спецыялісты, кіраўнікі раёнаў, мы звяртаемся да вас з заклікам прыняць усе меры да ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў жывёлагадоўлі! Адной з важнейшых задач у галіне жывёлагадоўлі з'яўляецца павелічэнне конскага пагалоўя, ліквідацыя падзяжу конскага маладняка і дарослых коней, стварэнне моцнай кармовай базы. Трэба ўсямерна пашыраць вопыт стахановцаў жывёлагадоўлі ва ўсіх калгасных фермах».

Удзельнікі нарады заклікаюць усіх калгаснікаў і спецыялістаў жывёлагадоўлі паспяхова выканаць дзяржаўны план развіцця жывёлагадоўлі па БССР у гэтым годзе; поўнасцю ліквідаваць бескароўнасць сярод калгаснікаў; падрыхтаваць сытую, цёплую зімоўку для ўсяго пагалоўя жывёлы калгасаў і соўгасаў; лепш наладзіць ветэрынарна-заатэхнічнае абслугоўванне жывёлы; павышаць тэхнічныя веды работнікаў жывёлагадоўлі і т. д.

ДА XXI ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

ДАКУМЕНТЫ ВЯЛІКІХ ДЗЁН

(У ЦЭНТРАЛЬНЫМ МУЗЕІ В. І. ЛЕНІНА)

Скарбніцу дакументаў па гісторыі гераічнай партыі большэвікоў — Цэнтральны музей В. І. Леніна навелваюць тысячы людзей. З любоўю яны вывучаюць радкі беражліва захоўваючыяся тут выдатных матэрыялаў. Жыватрапечачую цікавасць выклікаюць артыкулы і пісьмы В. І. Леніна, І. В Сталіна, газеты, карціны, фотаздымкі, узнаўляючыя слаўныя дні падрыхтоўкі і ходу ўзброенага паўстання ў кастрычніку 1917 года.

Дакументы аб Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі выстаўлены ў 9-м зале. Наведвальнікі з хваляваннем глядзяць на непрыязальныя рэчы, якімі карыстаўся Владзімір Ільіч, жывучы ў шалашы блізка ад станцыі Разліў, калі скрываўся ад праследвання контррэволюцыйнага Часовага ўрада. Чыгунны каталок, закопчаны бляшаны чайнік, піланажоўка, тапор, каса і граблі, тры вяслы. У шалашы Владзімір Ільіч піша кнігу «Государство и революция» адтуль праз сваіх саратнікаў і вучняў — Сталіна, Свердлова, Молатава, Орджанікідзе кіруе VI з'ездам, які напаўніў партыю большэвікоў на ўзброенае паўстанне.

У пачатку верасня ў Петраградскім і Маскоўскім Советах Рабочых і Салдацкіх дэпутатаў большэвікі заваявалі большасць. Вакол большэвіцкай партыі згуртаваліся найшырэйшыя масы рабочых і рэволюцыйнага сялянства Партыя стала рашаючай сілай рэволюцыі.

Владзімір Ільіч 12—14 верасня *) звяртаецца да Цэнтральнага, Петраградскага і Маскоўскага камітэтаў РСДРП(б) з пісьмом «Большевики должны взять власть».

«Атрымаўшы большасць у абодвух сталічных Советах Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў, большэвікі могуць і павінны ўзяць дзяржаўную ўладу ў свае рукі, — піша Ленін.

«Могуць, бо актыўная большасць рэволюцыйных элементаў і народа абодвух сталіц дастаткова, каб уцягнуць масы, перамагчы супраціўленне праціўніка, разбіць яго, заваяваць уладу і ўтрымаць яе Бо, прапануючы адразу-ж дэмакратычны мір, аддаючы адразу-ж зямлю сялянам аднаўляючы дэмакратычныя ўстановы і свабоды памятыя і разбітыя Керэнскім, большэвікі складуць такі ўрад, якога **ніхто не зваргне**»

Владзімір Ільіч у гэтыя-ж дні распрацоўвае канкрэтны план узброенага паўстання, вызначае нябачана ўзрослыя сілы рэволюцыі, намячае тактычны момант для нанясення рашучага ўдару Ён патрабуе адносіцца да паўстання, як да мастацтва.

Пісьмы Леніна абмяркоўваліся на пасяджэнні Цэнтральнага Камітэта большэвіцкай партыі. Здраднік Каменеў выступіў супроць указанняў Владзіміра Ільіча і прапанаваў спаліць пісьмы Правакатар атрымаў адпор Паводле прапановы таварыша Сталіна пісьмы былі разасланы для абмеркавання ў партыйныя арганізацыі.

Наступалі рашаючыя дні. Прысутнасць Владзіміра Ільіча — геніяльнага правадыра рэволюцыі — патрабавалася кожную мінуту. 3-га кастрычніка Цэнтральны Камітэт запісвае ў пратаколе свайго пасяджэння:

«2) Аб Ільічу.

2) Прынята рашэнне прапанаваць Ільічу перабрацца ў Піцер каб была магчымай сталая і цесная сувязь»

Вечарам 7-га кастрычніка з Выбарга (Фінляндыя) Владзімір Ільіч нелегальна прыязджае ў Петраград На наступны дзень ён сустракаецца з таварышам Сталіным. Гутарка працягваецца некалькі гадзін. Сталін падрабязна расказвае аб падзеях, уводзіць Ільіча ў курс справы. Момант сустрэчы адлюстраван мастаком Сварогам Ільіч толькі што ўстаўшы з-за пісьмовага стала, усміхаючыся, моцна паціскае руку Іосіфу Вісарыёнавічу

Дакументы музея ўзнаўляюць перадкастрычніцкую абстаноўку ў краіне. Па ўсёй Расіі падхоплен заклік большэвіцкай партыі: «Уся ўлада Советам!» Рабочыя фабрык і заводаў вышыбаюць з Советаў здраднікаў меншавікоў пасылаюць дэпутатамі большэвікоў Быстра растуць атрады чырвонагвардзейцаў з рабочых-добраахвотнікаў Рабочы клас гатоў пачаць узброеную барацьбу за ўладу Узнімаецца вёска. Сяляне самачынна захватваюць маёнткі, узворваюць памешчыцкія землі Контррэволюцыйны Часовы ўрад Керэнскага і К° падрыхтоўвае здраднічую здачу Піцера немцам каб задушыць рэволюцыйны пролетарыят, падавіць рэволюцыю.

Толькі прадбачанне і воля партыі Леніна — Сталіна перашкодзілі выканаць гэты гнусны замысел. Звяржэнне Часовага ўрада стала неадкладнай задачай Ацэньваючы падзеі, Владзімір Ільіч пісаў:

«Дарагія таварышы, падзеі **так** ясна прадпісваюць нам нашу задачу, што прамаруджанне становіцца сапраўды **злачынствам**».

На шэрай мрамарнай дошцы, пад люстэркавым шклом, у музеі захоўваецца гістарычная рэзалюцыя Цэнтральнага Камітэта партыі аб узброеным паўстанні Яна напісана 10 кастрычніка 1917 года рукою Ільіча.

«Прызнаючы, такім чынам, што ўзброенае паўстанне немінуча і ўпаўне назрала, ЦК прапануе ўсім арганізацыям партыі кіравацца гэтым і з гэтага пункту гледжання абмяркоўваць і вырашаць усе практычныя пытанні (з'езда Советаў Паўночнай вобласці, выводу войск з Піцера, выступленні масквічоў і менчан і т. д.)».

Пашыранае пасяджэнне Цэнтральнага Камітэта партыі большэвікоў 16 кастрычніка горача адобрыла рашэнне аб узброеным паўстанні Здраднік і прадажнікі Зіноўеў і Каменеў на гэтым пасяджэнні, як і на пасяджэнні ЦК 10 кастрычніка, выступілі супроць узброенага паўстання супроць звяржэння буржуазнага контррэволюцыйнага ўрада Яны нагла заяўлялі што пролетарыят не здолее ўзяць уладу ў свае рукі Здраднікі марылі аб буржуазным парламенце, аб захаванні капіталізма.

На іх з усёй сілай абрушыўся таварыш Сталін, які выкрыў контррэволюцыйную сутнасць лініі Каменева і Зіноўева.

Цэнтральны Камітэт Леніна Сталіна рашуча прыступюць паўстанне Ва ўсе канцы краіны пасылаюцца ўпаўнаважаныя ЦК Яны атрымалі задание забяспечыць падтрымку ў выступленні петраградскаму пролетарыяту і кіраваць паўстаннем на месцах Пры Петраградскім Совеце ствараецца па ўказанню Цэнтральнага Камітэта легальны цэнтр па кіраўніцтву паўстаннем—Ваенна-рэволюцыйны камітэт 16-га кастрычніка на пасяджэнні ЦК РСДРП(б) выбіраецца Партыйны цэнтр на чале з таварышам Сталіным для практычнага правядзення ўзброенага паўстання

Прэзрэнныя здраднікі Каменеў і Зіноўеў 18-га кастрычніка 1917 года апублікавалі ў меншавіцкай газеце «Новая жизнь» данос аб тым, што большэвікі рыхтуюць паўстанне Супроць гэтага нечуванага здрадніцтва і прадажніцтва выступае Владзімір Ільіч. Ён рашуча патрабуе выключэння здраднікаў з партыі. 19-га кастрычніка ў газеце «Рабочий путь» друкуецца «Письмо в товарищам», у якім Ленін паказвае сапраўднае контррэволюцыйнае нутро Зіноўева і Каменева.

Следам за здраднікамі Каменевым і Зіноўевым Іуда-Тропкі выдае контррэволюцыйным катам тэрмін паўстання Шайка здраднікаў усімі сіламі прабуе сарваць поспех узброенага паўстання пролетарыята.

24-га кастрычніка 1917 года, у 5 гадзін 30 мінут раніцы, атрад юнкераў нападае на друкарню, дзе друкуюцца большэвіцкія газеты «Рабочий путь» і «Солдат». Для абароны друкарні па ўказанню таварыша Сталіна пасылаюцца бранявік, атрады чырвонагвардзейцаў Збіраюцца групы рабочых. Яны адцясняюць юнкераў.

Раніцой 24-га кастрычніка засядае Цэнтральны Камітэт РСДРП(б), на якім прымаецца рашэнне пачаць узброенае паўстанне

У 11 гадзін раніцы выходзіць «Рабочий путь», у якім надрукаваны артыкулы В І Леніна «Новый обман крестьян партией эсэров», і артыкул І. В. Сталіна «Что нам нужно?» з заклікам звергнуць Часовы ўрад і перадаць уладу ў рукі Советаў

У 12 гадзін 30 мінут дня Керэнскі істэрычна патрабуе ад Прадпарламента надзвычайных паўнамоцтваў для ліквідацыі паўстання Позна Днём на старану паўстаўшых пераходзіць гарнізон Петрапаўлаўскай крэпасці Чырвонагвардзейцы і рэволюцыйныя часці занімаюць і ахоўваюць масты.

Вечар 24 кастрычніка Матросы флотскага экіпажа пад прыкрыццём гармат з «Аўроры» наводзяць Нікалаеўскі (цяпер імя лейтэнанта Шмідта) мост праз Неву, займаюць Петраградскае тэлеграфнае агенцтва.

У гэтыя рашаючыя мінуты Владзімір Ільіч знаходзіцца на тайнай кватэры Цэнтральны Камітэт партыі забараніў яму выходзіць: небяспечна. Аналізуючы ход падзей, ацэньваючы стварыўшаеся становішча, Владзімір Ільіч піша «Письмо членам ЦК», у якім патрабуе:

«Трэба, за што-б то ні стала сёння вечарам сёння ноччу арыштаваць. урад. абязброіўшы (перамогшы, калі будуць супраціўляцца) юнкераў і т. д.».

Владзімір Ільіч канчае пісьмо наступнымі словамі:

«Урад хістаецца. Трэба **дабіць** яго, у што-б то ні стала!

Прамаруджанне ў выступленні смерці падобна».

24-га вечарам таварыш Сталін пасылае на кватэру да Владзіміра Ільіча прадстаўніка ЦК В І Леніна у парыку абвязаўшы шчаку чырвонай хусткай, каля поўначы пакідае дом і пехатой ідзе ў Смольны.

Ноччу Іосіф Вісарыёнавіч інфарміруе Владзіміра Ільіча аб апошніх рашэннях ЦК. Ленін зацвярджае план паўстання і становіцца ля руля яго.

У гэту ноч узброеныя атралы рабочых занімаюць паштамт, вакзалы, электрастанцыі, і да раніцы 25 кастрычніка (7-га лістапада) 1917 года асноўныя тактычныя пункты знаходзяцца ў руках Ваенна-рэволюцыйнага камітэта.

25-га кастрычніка (7 лістапада) у 10 гадзін раніцы Ленін піша зварот «К гражданам России!»:

«Часовы ўрад звержан. Дзяржаўная ўлада перайшла ў рукі органа Петраградскага Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў — Ваенна-рэволюцыйнага камітэта, які стаіць на чале петраградскага пролетарыята і гарнізона».

Паміж 4 і 5 гадзінамі дня Часоваму ўраду пасылаецца ультыматум: здацца к 6 гадз 20 мін. Каля 8 гадзін вечара Владзімір Ільіч пасылае ў штаб Ваенна-рэволюцыйнага камітэта запіску з патрабаваннем паскорыць узяцце Зімняга дварца, дзе пад аховай юнкераў і жаночага батальёна схаваўся Часовы ўрад.

У 9 гадзін вечара з «Аўроры» раздаецца папераджальны халасты выстрал. У 11 гадзін вечара пачынаецца абстрэл Зімняга дварца.

Каля 2 гадзін ночы Зімні дварэц бяруць штурмам рабочыя, матросы і салдаты. У 2 гадзіны 30 мінут ночы арыштоўваюцца члены Часовага ўрада.

У 3 гадзіны ночы вестку аб перамозе слухае II з'езд Советаў які адкрыўся вечарам З'езд прымае адозву да рабочых, салдат і сялян аб перамозе пролетарскай рэволюцыі. З'езд прымае дэкрэты аб міры, зямлі і стварае першы Совецкі ўрад, главой якога выбіраецца Владзімір Ільіч Ленін.

27-га кастрычніка (9/XI) зноў выходзіць «Правда». Над палаской гарачыя словы заклику:

«Няхай жыве рэволюцыйны ўрад Советаў!».

«Рабочыя, салдаты, сяляне—усе, як адзін чалавек, стойце за гэту народную ўладу!».

Пачаўся перыяд трыумфальнага шэствія Совецкай улады

В. ПЛІШКІН.

*) Усе даты даны па старому стылю.

КАНДЫДАТ НА ВЫСТАЎКУ

Заслужана карыстаецца славай калгас «Труд», Хойніцкага раёна. Яшчэ ў мінулым годзе за высокі ўраджай зерневых калгас залічан кандыдатам на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку.

Не гледзячы на засушлівае лета, у гэтым годзе таксама ўраджай быў нядрэнным. Асабліва добра ўрадзіла пшаніца. Па плошчы ў 24 гектары ў сярэднім атрымана з кожнага гектара па 23 цэнтнеры буйнага, чыстага зярна. У брыгадзе Владзіміра Галдэцкага ураджай вышла па 25 цэнтнераў з гектара.

Ячмень вырас не горш пшаніцы — па 23 цэнтнеры з гектара. Авёс даў па 20 цэнтнераў, жыта—14.

На калгасным зямлі быў участак у 5 гектара белага сыпучага пяску. На пяску нічога не расло. Сёлета там налажылі гной, суперфасфат, калійную соль, селітру, глебу старанна апрацавалі і пасеялі канаплі. Усходы падкармілі. Канаплі выраслі ў два метры вышынёй.

У калгасе ёсць нямала стаханаўцаў. Даўрэн Каваленка, Фёдар Салаўёў, Хаім Капараўскі, Цярэшка Даўбашкін, Гапа Думская, Фёдар Дзенісенка і многія іншыя норму перавыконваюць у два-тры разы.

Падыходзіць к канцу сельскагаспадарчы год. Калгаснікі радуюцца здабыткамі сваёй упорнай работы. Атрыманы сталінскі ўраджай забяспечыў багаты працадзень.

Авансам на працадні выдана пшаніца, яблыкі, бульба. Пры канчатковым размеркаванні даходаў на кожны працадзень будзе прыпадаць звыш 3 кілограмаў зярна, з якіх 2 пшаніцы, і па 1 рублю грашыма.

Сёлета калгаснікі пабудавалі 12 новых дамоў. Дзеці кожнага калгасніка ходзяць у школу, а ў Васіля Салаўёва школу наведваюць 5 дзяцей 15 чалавек калгаснай моладзі навучаецца ў інстытутах і тэхнікумах.

Калгаснікі — адданыя патрыёты сваёй сацыялістычнай радзімы. Нядаўча лепшага стаханаўца Аляксандра Малашчанку і іншых маладых калгаснікаў праводзілі ў Чырвоную Армію. У адказ на зварот аб арганізацыі масавай абаронная работы калгаснікі абавязаліся вывучыць вайсковую справу.

Г. СЯРГЕЕНКА.

ПАТУРАЮЦЬ САБАТАЖНІКАМ

КІРАУСК. Аднаасобнікі Грыбавецкага сельсавета здалі дзяржаве ўсяго 14 цэнтнераў зярна, а патрэбна здаць 61. Такія аднаасобнікі, як Сяргей Ганчароў, Пятро Гаўрыленка, Рыгор Заграбанец зусім не прыступілі да выканання плана хлебапаставак. У гэтым сельсавеце яшчэ ні адзін аднаасобнік поўнасцю не разлічыўся з дзяржавай, а аднаасобным сектарам сельсавета кіруе нядоімак збожжа 7 225 кг. Усё гэта зусім мала турбуе старшыню Грыбавецкага сельсавета тав. Стрыжэдку.

У Любовіцкім сельсавеце ёсць каля 100 аднаасобных гаспадарак і ні адна іх яшчэ не выканала плана зернапаставак. Аднаасобнік Якаў Лазаковіч з вёскі Морхавічы з года ў год не выконвае ўсіх дзяржаўных абавязацельстваў, а кіраўнікі сельсавета з ім ліберальнічаюць.

Прыкладна такое-ж становішча і ў Лешчанскім сельсавеце. Тут таксама некаторыя аднаасобнікі сабатуюць выкананне дзяржаўных абавязацельстваў. Аднаасобнік вёскі Барчыцы Рыгор Дзям'янаў не здаў за гэты год дзяржаве 148 кг зярна. Платон Міхайлаў—120 кг., нядоімкі мінулага года—140 кг.

План абавязковых паставак па раёну аднаасобнікі выканалі толькі на 58 проц. Кіраўнікі раёна і ўпаўнаважаны наркамата загатовак тав. Елісеевіч нічога сур'ёзнага не зрабілі, каб забяспечыць выкананне аднаасобнікамі раёна абавязацельстваў перад дзяржавай.

Гр. ОСІПАЎ.

ПОЎНАСЦЮ РАЗЛІЧЫЛСЯ З ДЗЯРЖАВАЙ

Калгаснікі сельгасарцелі імя Варашылава, Забалоцкага сельсавета, Смаляніцкага раёна, рыхтуюць дастойную сустрэчу XXI гадавіне Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. У гонар надыходзячага свята калгас поўнасцю разлічыўся з дзяржавай па ўсіх відах паставак.

Калгас заканчвае копку бульбы. Перадавая брыгада Нікалая Кашэля поўнасцю выканала свой план уборкі бульбы.

Многія калгаснікі працуюць па-стаханаўску. Калгасніца Ліза Канюшык замест нормы 500 пагонных метраў бульбы выбірае па 1 200 метраў. Ольга Пусько і Маня Кашэль даённую норму выконваюць у паўтара-два разы.

М. ЮДКЕВІЧ.

100 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ ПРЫБЫТКУ АД КАНЮШЫНЫ

КОПЫЛЬ. Калгас «Пяцігодка», Ванеўскага сельсавета, атрымаў высокі ўраджай канюшыны. З насеннікаў канюшыны намалочана шмат насення. Зараз калгас здае дзяржаве насенне канюшыны. Ужо здадзена 30 цэнтнераў (план 1,5 цэнт.) і ў бліжэйшыя дні будзе здадзена яшчэ 40 цэнтнераў. За ўсё насенне канюшыны калгас атрымае каля 100 тысяч рублёў.

Л. ЛЕЙБОВІЧ.

ЗРЫВАЕЦЦА ЗЯБЛІВАЕ ВОРЫВА

КРУПКІ. Калгасы многіх сельсветаў раёна недапушчальна зацягваюць зяблівае ворыва.

Так, напрыклад, калгасы Напкага сельсавета на 15 кастрычніка план яблівага ворыва выканалі на 27 проц., некаторыя калгасы, як «Чырвоны Кастрычнік», імя Молатава і інш.,—на 5—10 проц.

Не лепш і ў Ухвальскім сельсавеце. План зяблівага ворыва па сельсавету выканан на 19 проц., а ў некаторых калгасах і таго менш.

Дрэнна арганізавалі працу па падняццю зяблівага Ігрушацкая і Крупская МТС. Работа праходзіць з перабоямі, неарганізавана. За апошні час прастойваюць 48 трактараў у Крупскай МТС з-за адсутнасці змазачнага матэрыялу. План зяблівага ворыва па гэтай МТС выкананы толькі на 8,6 проц.

П. КРЫВІЦА.

УЗОРНА ПРАВЕСЦІ РАЗМЕРКАВАННЕ ДАХОДАЎ

МОЗЫР. (Кар. «Звязды»). Калгасы Палескай вобласці, разгортваючы социялістычнае спаборніцтва і стаханаўскі рух, дабіліся ў гэтым годзе значнага павышэння ўраджайнасці палёў і вагі калгаснага працадня.

У многіх калгасах на працадзень выдаюць 3—4 кілограмы зернавых, 5—10 кілограмаў бульбы і грошы.

Калгаснікі сельгасарцелі імя Тэльмана, Брагінскага раёна, атрымаюць на кожны працадзень больш 3 кілограмаў збожжа і больш 4 рублёў грашыма. Калгас «Чырвоны сцяг», Тураўскага раёна, размяркуе на кожны працадзень звыш 3 кілограмаў збожжавых і па 10 кілограмаў бульбы.

У павышэнні вагі калгаснага працадня велізарную ролю адыграла пастанова Соўнаркома Саюза ССР і ЦК ВКП(б) «Аб няправільным размеркаванні даходаў у калгасах». Яна з'яўляецца магутнай зброяй у руках калгаснікаў у барацьбе за далейшы рост заможнасці. Але гэту пастанову вельмі часта парушаюць не толькі калгасы, а і кіруючыя раённыя арганізацыі.

Так, Глускі, Лельчыцкі, Капаткевіцкі, Жыткавіцкі і іншыя райвыканкомы да гэтага часу не зацвердзілі дзесяткі калгасных каштарысаў, што перашкаджае калгасам рэгуляваць расходаванне сваіх сродкаў.

Прыходна-расходныя каштарысы ў калгасах Лельчыцкага, Васілевіцкага, Капаткевіцкага і іншых раёнаў не выконваюцца. У калгасе «Новая ніва», Лельчыцкага раёна, зараз па прыходу нехапае 71 тысячы рублёў і, апрача гэтага, грошы, вызначаныя на працадні, расходваюцца на іншыя патрэбы.

У калгасе «Чырвоны араты», Васілевіцкага раёна, толькі на наём рабочай сілы (хапя сваёй дастаткова) расходавана 1104 руб. Калгас «Чырвоны шлях», таго-ж Васілевіцкага раёна, на наём рабочай сілы расходваў 1800 рублёў грошай, якія павінны выдавацца на працадні. Старшыня калгаса Рудзянок не дазваляе выдаваць авансы па працаднях, між тым, як па розных яго распараджэннях, якія пішуцца на кавалках паперы, раздана 6 тон хлеба і 1500 рублёў грашыма.

Кіраўнікі некаторых калгасаў не зразумелі, што рэзультаты года могуць быць правільна вызначаны толькі пасля таго, як яны поўнасцю выканаюць дзяржаўныя абавязацельствы, змалотяць і захаваюць ураджай.

Хлебапастаўкі зацягнулі. Калгасы імя Шэўчэнка, імя Чапаева, Мозырскага раёна, план здачы дзяржаве хлеба выканалі не больш чым на 60 проц., а да здачы натураплаты МТС не прыступалі. Малацьбу ў вобласці таксама зацягнулі.

Наступае адказнейшая работа—размеркаванне даходаў. Размеркаванне трэба правесці строга ў адпаведнасці са статутам сельгасарцелі. Аднак на Палессі да размеркавання даходаў не падрыхтаваліся.

С. БАЧУРА.

400 ЦЭНТНЕРАЎ БУЛЬБЫ З ГЕКТАРА

Стаханаўцы раду калгасаў Барысаўскага раёна, Менскай вобласці, дабіліся выдатных поспехаў у барацьбе за высокі ўраджай бульбы. Рэкордны ўраджай — каля 400 цэнтнераў з аднаго гектара — атрымалі стаханаўскія звенні тав. Гарлеўскага з калгаса «Рой» і тав. Ліхачэўскага з калгаса «Чырвоны барацьбіт».

У калгасе «Большэвік» (гэтага-ж раёна) сярэдні ўраджай бульбы з усёй пасеўнай плошчы ў 22 гектары склаў па 210 цэнтнераў. Уся бульба была ўбрана да 18 кастрычніка. Узоры стаханаўскай работы паказала звяно 50-галовага калгасніка тав. М. К. Шэршня, які а года ў год змагаецца за высокі ўраджай бульбы. Тав. Шэршань—бацька байца-далёкаўсходніка, удзельніка баёў з японскімі налётчыкамі ля возера Хасан.

Калгас «Большэвік» вылучан экспанентам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Совецкая тэхнічная інтэлігенцыя завода. Былыя рабочыя менскага станкабудаўнічага завода імя Кірава на тым-жа заводзе зараз працуюць інжынерамі. НА ВЫЛІМКУ: (злева направа) інжынеры тэхнічны дырэктар завода тав. Г. С. Гершун, інжынер-тэхнолаг аддзела падрыхтоўкі да вытворчасці тав. Л. М. Рубенчык, старшы інжынер-канструктар тав. Ф. Л. Марон і тэхнік — тэхнічны кіраўнік механа-зборачнага цэха В. Л. Жалнаркевіч.
Фото С. Грына.

Жорж Бізэ

(Да стагоддзя з дня нараджэння)

Гісторыя музыкальнай культуры налічвае нямала імён смелых мастакоў-рэфарматараў, ламаючых ранейшыя традыцыйныя формы, адкідваючых старыя прыёмы, як не адпавядаючыя іх творчым установкам. Бізэ — не рэфарматар. Жанр оперы захоўвае ў Бізэ ўсе ўласцівыя гэтаму жанру фармальныя асаблівасці, якія вызначаліся ў оперных творах шматлікіх кампазітараў розных нацыянальнасцей, працаваўшых да Бізэ. Тым не менш, роля Бізэ ў галіне оперы надзвычай значная.

Каб выясніць гістарычнае значэнне творчасці Бізэ, неабходна коратка ахарактарызаваць стан опернага мастацтва ў Францыі к часу дзейнасці кампазітара, г. зн. к другой палавіне XIX стагоддзя.

Гэта быў час крызіса оперы ў розных яе рознавіднасцях, час здрабнення і збяднення яе ідэйнага зместу.

Асноўны оперны тэатр Парыжа — Гранд Опера, які наведвала прывілеяваная буржуазная публіка, становіцца аплотам і ахаяніцелем руціны і коснасці ў оперным мастацтве. У яго не пранікаюць новыя, свежыя веянні, бо французская буржуазія гэтага часу ўжо нічога агульнага не мае з буржуазіяй гераічных год рэволюцыі 1793 года. Гераічныя імпульсы ўступаюць месца прагнасці да абагачэння. У оперы бачаць не высокаідэйнае мастацтва, а сродак забавы і адпачынку пасля ліхаманкава-сцяжальніцкай дзейнасці.

У гэтай абстаноўцы, як перадавы, дэмакратычны мастак, фарміруецца Бізэ. Яго не задавальняе музыкальная рэчаіснасць другой палавіны XIX стагоддзя. Ён імкнецца да жыццёвага, праўдзівага, поўнацэннага опернага мастацтва, да даступнасці і даходлівасці сваёй музыкальнай мовы, ён настойліва вывучае народны быт і музыку, узбагачае і насычае сваю творчасць поўнакроўнымі і красачнымі мелодыямі народных танцаў і песень. Таму так ярка і лёгка запамінаецца музыка Бізэ. Гэта музыка напісана вялікім майстрам і чулым мастаком, моцна звязаным з багацейшай крыніцай народнага мастацтва. У гэтым — доўгавечнасць і папулярнасць яго творчасці.

«Кармен» Бізэ з'яўляецца адной з папулярнейшых опер. Яна ідзе на оперных сцэнах усяго свету і карыстаецца нязменным поспехам у найшырэйшых мас.

***

Жорж Бізэ нарадзіўся 25 кастрычніка 1838 года ў музыкальнай сям'і. Бацька яго быў настаўнікам спеваў. Маці разумела і любіла музыку. Хлопчык вельмі рана пачынае сур'ёзна займацца музыкай. Першыя ўрокі яму дае маці, а ў 9 год ён паступае ў Парыжскую кансерваторыю па класах кампазіцыі і фартэпіяна. Вялікія здольнасці і працавітасць прыносяць Бізэ рад прэмій за добрыя поспехі ў вучобе. З так званай вялікай рымскай прэміяй малады музыкант аканчвае кансерваторыю ў 1857 годзе. Гэта прэмія давала магчымасць творчай паездкі ў Рым, у Італію, якая здаўна лічылася тады самай музыкальнай краінай у Еўропе.

У Італіі Бізэ піша свае першыя буйныя творы, оперы і сімфоніі. Пасля атрымання паведамленняў аб хваробе маці Бізэ вяртаецца на радзіму, дзе адразу пагружаецца ў мора жыццёвых клопатаў і беспакойстваў аб пошуках заработку. Ён шмат і прадукцыйна працуе, ствараючы оперы, інструментальную музыку, рамансы і танцавальную музыку.

Імкнучыся да поўнакроўнага, рэалістычнага мастацтва, Бізэ праз сваю творчасць стаў у апазіцыю да ўсёй музыкальнай грамадскасці. Музыкальная крытыка не разумела своеасаблівасці творчасці Бізэ і адмоўна сустрэла з'яўленне яго твораў. Оперы Бізэ, не ацэненыя па дастоінству, быстра сходзілі са сцэны. Апошні твор кампазітара, яго геніяльная опера «Кармен» была спаткана таксама холадна і абыякава. Бізэ надзвычай востра перажываў правал свайго апошняга і любімага дзеціща. Вельмі хутка пасля першай няўдалай пастаноўкі «Кармен», 3 чэрвеня 1875 года, Бізэ памёр, поўны творчых сіл, на 37 годзе жыцця.

***

Бізэ пакінуў вялікую і рознастайную музыкальную спадчыну: 7 закончаных опер, музыку да драмы Додэ «Арлезіанка», 3 аперэты, рад аркестравых, фартэпіянных і вакальных твораў. Можна не ведаць опер «Искатели жемчуга», «Джамиле», «Пертская красавица», можна не чуць фартэпіянных п'ес і рамансаў Бізэ, і ўсё-такі мець яснае, ніколі не забываемае ўражанне аб кампазітару, праслухаўшы яго «Кармен».

У гэтай оперы, як у фокусе, сканцэнтраваны ўсе характэрныя рысы яго творчасці. Навела Мерыме, пакладзеная ў аснову зместу оперы, побач з рамантычнай усхваляванасцю сюжэта, паказвае непрыфарбаванае, рэальнае жыццё іспанскіх цыган, акрэсленае трапнымі і праўдзівымі штрыхамі.

Народ актыўны, жыццерадасны і тэмпераментны — вось тая рэалістычная і поўнакроўная жыццёвая абстаноўка, у якой адбываецца драматычная сутычка асобных прадстаўнікоў гэтага-ж народа — цыганкі Кармен, салдата Хозе і тарэадора Эскамільо. Музыкальная мова оперы, выключна выразная і яркая, насычана інтанацыямі народнага мастацтва.

Не адкідваючы традыцыйныя, закончаныя оперныя формы — арыі, ансамблі, хоры, — Бізэ гібка і вольна скарыстоўвае іх. Гэта — то рэалістычная перадача вясёлага, бойкага гоману вуліцы ў Севільі, то народная жанравая сцэнка пасварыўшыхся работніц табачнай фабрыкі, то магутная карціна святочнага лікавання народа перад цыркавым прадстаўленнем, то іспанскія і цыганскія народныя песні і пляскі. Кампазітар незвычайна любоўна і цёпла апісвае сваіх герояў, выхадцаў з народнага асяроддзя.

Не ствараючы асаблівых музыкальных характарыстык, так званых лейтматываў, для абрысоўкі асобных персанажаў оперы, Бізэ тым не менш характарызуе іх прадзельна выпукла і ярка, зусім іншымі музыкальна-выяўленчымі сродкамі. Для Кармен гэта—тэмпераментныя іспанскія і цыганскія песні і танцы, для Хозе — прасякнутыя глыбокім лірызмам або здаровай страсцю музыкальныя інтанацыі.

Яркая і самабытная музыкальная мова оперы, паміма шырокага скарыстання народна-песеннага матэрыялу, склалася ў рэзультаце мэтазгоднага ператварэння ўплываў буйнейшых прадстаўнікоў опернай культуры—Росіні, Гуно і асабліва Вердзі.

«Кармен» з'явілася вяршынай творчасці не толькі Бізэ, але і французскай опернай творчасці ў цэлым. Услед за з'яўленнем «Кармен» пачынаецца распад французскага рэалістычнага мастацтва. Таму цяжка гаварыць аб заходняй музыкальнай школе, створанай мастацтвам Бізэ. Уплыў яго несумненны на творчасць італьянскіх кампазітараў Пучыні, Леанкавала, але падняцца да ўзроўню «Кармен» нікому з іх не ўдалося.

Сапраўднае развіццё прынцыпаў народнага, рэалістычнага музыкальнага мастацтва, закладзеных у «Кармен» Бізэ, можа быць толькі ў творчасці совецкіх кампазітараў, якія імкнуцца праўдзіва і выразна адлюстроўваць многагранную, жыццерадасную рэчаіснасць краіны перамогшага социялізма.

Ал. КАРПОВІЧ.

У БАЯХ ЗА РАДЗІМУ

«...Ленін даў лозунг — «усё для фронта», і сотні тысяч рабочых і сялян пайшлі добраахвотнікамі ў Чырвоную Армію, на фронт. Каля палавіны ўсяго састава партыі і комсамола пайшло на фронт. Партыя падняла народ на вайну за бацькаўшчыну супроць нашэсця войск замежнай інтэрвенцыі, супроць мяцежаў звергнутых рэволюцыяй эксплаататарскіх класаў».

(Гісторыя Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў).

Рэспубліка стаяла пад ружжом. Граніцы франтоў спіскаліся, ворагі падступалі да самага сэрца рэволюцыі. Партыя большэвікоў арганізавала і павяла ў бой супроць інтэрвентаў і белагвардзейцаў мільённыя масы рабочых і сялян. Бясспрыкладная самаадданасць і нябачаны гераізм Чырвонай Арміі і ўсяго народа забяспечылі перамогу Совецкай рэспублікі. У першых радах гераічных абаронцаў айчыны разам з бацькамі змагаліся дзесяткі тысяч комсамольцаў, маладых рабочых і сялян. Не было ні адной комсамольскай арганізацыі, якая ў гэтыя годы не адправіла б лепшых сваіх сыноў у рады Чырвонай Арміі.

Пажаўцелыя старонкі пратаколаў расказваюць аб баявых справах першых арганізацый РКСМ. У спіску членаў комуністычнага саюза моладзі Ахромскага павета, Маскоўскай губерні, амаль супроць кожнага прозвішча стаялі паметкі: «на фронце», «у Чырвонай Арміі», «на ваенных курсах».

Так было ўсюды. Той, хто ўступаў у рады комсамола, адразу-ж ішоў на фронт. У прыфрантавых раёнах у Чырвоную Армію ішлі пагалоўна ўсе члены арганізацыі. Нярэдка на дзвярах комсамольскіх камітэтаў можна было прачытаць лаканічную запіску: «Райком закрыт, усе пайшлі на фронт».

29 кастрычніка 1918 года адбыўся Першы Усерасійскі з'езд РКСМ. Дэлегаты з'езда, прыбыўшыя з франтоў, расказвалі аб першых днях баявога хрышчэння комсамола:

— На Урале ўся моладзь пайшла на абарону свабоды.

— У Кіеве праведзен збор зброі. Арганізаван атрад для барацьбы з контррэволюцыяй.

— Казань узята владзімірскім атрадам, у якім многа членаў саюза моладзі...

Вясной 1919 года Калчак падступіў да Волгі. Супроць яго былі кінуты лепшыя сілы партыі, мабілізаваны комсамольцы, рабочыя. На фронт! На дапамогу фронту! — такі быў лозунг.

Вестка аб першай усерасійскай мабілізацыі комсамола ўсюды была сустрэта з вялікім уздымам. Ужо на другі дзень мабілізацыі атрад у 300 маскоўскіх комсамольцаў адправіўся на фронт. Петраград у гэтыя дні даў 800 комсамольцаў — у восем разоў больш, чым належала па плану мабілізацыі. Царыцынская, самарская комсамольскія арганізацыі пайшлі на фронт у поўным саставе.

Восень 1919 года. Другі з'езд РКСМ прымае рашэнне: «Становішча на фронце сур'ёзнае. Дзенікін прасоўваецца к цэнтру Совецкай Расіі — Туле і Маскве... Для абароны рэспублікі і абслугоўвання фронта і тылу Чырвонай Арміі правесці мабілізацыю членаў саюза ад 16 год...»

Літаральна за некалькі дзён пастанова была выканана. Комуністычны саюз моладзі даў Чырвонай Арміі 10 000 байцоў.

Комсамольскія арганізацыі праводзілі шматлікія частковыя мабілізацыі: на барацьбу з Юдзенічам, на вранглеўскі фронт, у ваенныя школы, у органы ЧК, у лётныя часці, на курсы чырвоных сяцёр, армейскіх палітработнікаў і т. д. Па далёка няпоўных даных, комсамол даў Чырвонай Арміі звыш 25 тысяч маладых байцоў-комсамольцаў. Дзесяткі тысяч членаў комуністычнага саюза моладзі ішлі добраахвотнікамі на фронт без спецыяльных мабілізацый.

Тысячы маладых рабочых ішлі ў харчовыя атрады, змагаліся са спекулянтамі і мяшочнікамі, забяспечвалі хлебам Чырвоную Армію і прамысловыя цэнтры. Комсамольцы ўліваліся ў часці асобага назначэння, дапамагалі партыі ў барацьбе з контррэволюцыяй з сабатажам і шкодніцтвам у тылу. Тысячы комсамольцаў прымалі ўдзел у апалавых суботніках, у арганізацыі дапамогі фронту, сем'ям чырвонаармейцаў.

Не гледзячы на труднасці, выкліканыя грамадзянскай вайной, не гледзячы на ўход актыўнай часткі саюза на фронт, комсамол няспынна папаўняў свае рады.

Кал да I з'езда РКСМ у саюзе моладзі налічвалася ўсяго 22.000 членаў, то ў 1919 годзе іх было 96 тысяч, а ў 1920 годзе — 400 тысяч. Комсамол рос, комсамол мужнеў, мацнеў, гартуючыся ў агні рэволюцыйнай барацьбы.

Партыя большэвікоў аддавала велізарную ўвагу падрастаючаму пакаленню. VIII з'езд Комуністычнай партыі (большэвікоў), які праходзіў у лютым 1919 года, адзначыў у сваіх рашэннях, што Расійскі комуністычны саюз моладзі выконваў велізарную работу па арганізацыі і комуністычнаму выхаванню моладзі, прыцягненню яе да «непасрэднага будаўніцтва комуністычнага грамадства і да абароны Совецкай рэспублікі».

Комсамол апраўдаў высокае давер'е партыі. Гісторыя захавала мноства прыкладаў самаадданасці, мужнасці, баявой адвагі моладзі, яе бязмежнай адданасці большэвіцкай партыі, вялікім правадырам рэволюцыі Леніну і Сталіну.

Ніколі не загасне слава бясстрашнай уральскай сотні комсамольцаў, адважных барацьбітоў бронепоезда імя комсамола Украіны, комсамольцаў—герояў Трыполля, першай Амурскай партыйна-комсамольскай сотні.

...Малады рабочы Маскоўскага трамвайнага парка тав. Афанасьеў у жніўні 1918 года ўступіў у комуністычны атрад Хутка ён быў назначан начальнікам кулямётнага дзесятка. Ніколі да таго не бачыўшы кулямёта Афанасьеў па дарозе на перадавыя лініі фронта вывучыў яго.

Аднаго разу ў часе баявой аперацыі пад ударамі праціўніка полк не вытрымаў і пачаў адступаць. Афанасьеў астаўся са сваім дзесяткам, разгарнуў кулямёты на подступах да моста і ўраганным агнём затрымаў праціўніка. Хутка дзевятнаццацігадовы комсамолец Афанасьеў быў назначан камісарам палка.

Колю Руднёва, народнага героя, ніколі не забудуць прапоўныя нашай краіны.

Русавалосы юнак Нікалай Руднёў камандаваў палком. Ён быў бясстрашны ў баі, смелы ў рашэннях і байцы ішлі за ім на подвіг! Здольнейшы ваенна-начальнік, ён кіраваў адказнымі баявымі аперацыямі, а калі патрэбна было—сам браўся за кулямёт.

Тав. Сталін, які асабіста ведаў Колю Руднёва, начальніка штаба 5-й арміі, пісаў у армейскай газеце «Солдат революции»:

«З глыбокім жалем адзначаю геройскую смерць тав. Руднёва на злаўным пасту воіна. Вечная памяць беззаветнаму воіну комунізма! Помста бязлітасная царскім генералам і іх прыхвасням — есаулам!».

Аб рабоце ў тылу ў ворага ўспамінае І. А. Рыбін, былы начальнік баявога дзесятка палпольнай комсамольскай арганізацыі Владзівастока.

«23 кастрычніка (1922 года. — Рэд.) большэвікам стала вядома, што белагвардзейцы збіраюцца ноччу 24 кастрычніка заталіць нікім не ахоўваемы эскадронны мінаносец «Бойкі», які не быў у страі. Шэсць комсамольцаў атрымалі заданне выратаваць мінаносец. Яны занялі яго і выставілі пасты. У поўнач да мінаносца падышоў белагвардзейскі кацер. Моладзь пачала страляць у яго з вінтовак. Белагвардзейцы ў адказ адкрылі агонь, але не ведаючы нашых сіл і мяркуючы, што нас многа, пусціліся наўцёкі.

Пакінуўшы трох чалавек на карабліі для аховы, мы адправіліся ў флоцкі экіпаж. Каля раз'езда ўбачылі два пламбіраваныя вагоны. Адчынілі дзверы і выявілі цэлы арсенал—зброю, гранаты, патроны. Мы паклікалі рабочых і мігам усё разгрузілі. Большэвіцкі камітэт тут-жа арганізаваў рабочы атрад самаабароны. Хутка былі заняты марскі шпіталь і электрастанцыя завода. Трохі пазней над флоцкім экіпажам узвіўся чырвоны сцяг і эмаль у тэты-ж час у горад увайшла народна-рэволюцыйная армія».

Партыя і ўрад высока ацанілі баявыя заслугі, гераізм дзесяткаў тысяч комсамольцаў, якія сталі на абарону бацькаўшчыны. Ленінска-сталінск комсамол узнагароджан ордэнам Чырвонага Спяга.

***

Слаўныя традыцыі комсамольцаў — герояў грамадзянскай вайны—жывуць і зараз. Нядаўна японскія самураі на ўласнай шкуры пераканаліся ў магутнасці грознай совецкай зброі, у цвёрдасці і непарушнасці свяшчэнных совецкіх граніц.

У баях з японскімі захватчыкамі ў раёне возера Хасан комуністы комсамольцы былі ў першых радах на лініі агню. Байцы і камандзіры ішлі ў бой з імем вялікага Сталіна і перамаглі.

...Раніцой атрымалі задачу: «6 жніўня заняць вышыню Заазёрную і месцы да яе прылягаючыя».

— Перад боем тут-жа ў акопах, расказвае Георгій Сазыкін, удзельнік баёў, — была склікана нарада комсамольскага актыва. Абмяркоўваецца пастаўленая перад намі задача. Мы ўспамінаем гераічныя эпізоды з перыяда грамадзянскай вайны...

Слаўныя традыцыі грамадзянскай вайны жывуць і зараз, яны натхняюць байцоў на подвігі ў імя радзімы.

...Чырвонаармеец Пазнякоў у баі выконваў адказную ролю—быў кулямётчыкам. Меткім агнём ён расстрэльваў японскіх праважатараў. Калі выбыў кулямёт са строю, таварыш Пазнякоў пад ураганным агнём праціўніка перайшоў у другі акоп, узяў кулямёт таварыша і прадаўжаў весці агонь. Тры раненні атрымаў Пазнякоў, але да канца бою не пайшоў, прадаўжаў змагацца за радзіму. У акоп да Пазнякова папалі дзве японскія гранаты; ён іх хутка падхапіў і кінуў назад у наступаўшага ворага...

Калі Іван Ігнацьеў — машыніст электрастанцыі — даведаўся, што яго часць выступае да возера Хасан, ён прышоў да камісара і сказаў, што павінен ісці ў бой. Камісар дазволіў. Замаскаваны ад ворага, Іван Ігнацьеў вёў знішчальны кулямётны агонь, не гледзячы на артылерыйскі агонь самураяў.

Вельмі ўмацаваўся вораг, але не вытрымаў і быў прымушан уцякаць.

І тады чырвонаармеец Іван Ігнацьеў заявіў таварышам:

— У бой ішоў я некомсамольцам, і палітруку сказаў: калі забіюць, лічыце комсамольцам. Жывы астаўся, пяпер падаю заяву і прашу прыняць мяне ў рады ВЛКСМ.

І ў надыходзячых баях совецкая моладзь выступіць на абарону сваёй радзімы таксама, як у годы грамадзянскай вайны выступалі петраградскія металісты, сібірскія партызаны, матросы Балтыкі і шахцёры Данбаса. Яна будзе змагацца і перамагаць пад сцягамі партыі Леніна—Сталіна таксама, як перамагалі героі возера Хасан.

Ш. АФАНАСЬЕЎ.

З АПОШНЯЙ ПОШТЫ

ПАСЛЯ ПОДПІСУ РЭДАКТАРА

У аршанскай раённай газеце «Ленінск шлях», як і ў іншых газетах, змяшчаюцца аб'явы. Рэч добрая, патрэбная і карысная. Але бяда ў тым, што яны падаюцца ў гэтай газеце неахайна, непісьменна, што часамі прыводзіць да курʼёзаў.

Напрыклад, у нумары за 21 кастрычніка аршанская газета змяшчае такую аб'яву:

«Аршанскаму ільнакамбінату патрабуецца: мужчын 50 чалавек, жанчын 60 чалавек, качагараў 10 чалавек, матарыстаў 5, падвозчыкаў 10...».

Мы дазволім сабе запытаць у рэдактара тав. Зярніцкага: а качагары, матарысты, падвозчыкі павінны быць абавязкова мужчынамі, ці жанчыны таксама могуць паступіць на гэту работу?

У гэтай-жа газеце змяшчаецца другая аб'ява, у якой Энергазбыт аршанскага аддзялення Белэнергазбыта паведамляе, што заяўкі на ілюмінацыйныя ўстаноўкі павінны быць паданы не пазней 27 кастрычніка, прычым:

«Уключаныя без дазволу будуць адключаны і на іх накладзен (?! **Рэд.**) штраф ад 100 да 300 р.».

Ці нельга паменш «уключэнняў» і «адключэнняў», а пабольш граматнасці, таварышы з рэдакцыі!

Відавочна, рэдактар аршанскай газеты тав. Зярніцкі не чытае аб'яў, а трэба было-б перад выпускам у свет газеты заглядваць за лінейку свайго подпісу. Аб'явы патрабуюць таксама пільнай увагі.

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН

ЛІРЫЧНАЯ ДУША

Яго ўлюбёная тэма—аб бітвах і перамогах. Кожны дзень у яго новыя расказы аб сваіх паходжаннях і перамогах на сардэчным участку бытавога фронта. Ён любіць аб гэтым расказваць, макаючы кожнае слова. Больш таго, ён бачыць у гэтых паходжаннях элементы нейкай доблесці. І расказваючы аб сваіх любоўных прыгодах, прыстальна заглядвае ў вочы субяседнікаў, жадаючы прачытаць там наступнае:

— Вось дык малайчына!..

Але нічога гэтага ў вачах сваіх субяседнікаў ён прачытаць не можа. Наадварот, таварышы не раз папракалі яго за дрэнныя паводзіны. На гэта ён спакойна адказвае:

— У мяне лірычная душа. Яна патрабуе прастору.

І з-за гэтай самай лірычнай душы студэнт менскага педагагічнага інстытута Крывашэеў, які лічыцца комсамольцам, не можа прытрымлівацца вядомых норм паводзін.

— У мяне шырокая натура, — гаворыць ён.—Сёння гуляю з адной, заўтра—з другой, паслязаўтра—з трэцяй.

Ён пархае, як матыль, гэты папрыгунчык. Гуляў з Б.—кінуў. Гуляў з С. — кінуў. Гуляў з М. — кінуў.

Чарговым прадметам яго страснага захаплення была студэнтка гэтага-ж інстытута комсамолка Н.

Як загартаваны баец на любоўным фронце, Крывашэеў ужываў усе сродкі наступлення. Ён метадычна вёў атаку не даючы праціўніку апомніцца.

Ах, якія лірычныя напевы зляталі з яго вуснаў! Якія гарачыя словы! Ён кляўся ў каханні імем усяго святога. Ён гаварыў, што Н. — яго мара, яго жыццё. Ён абяцаў быць верным да самай смерці. Ён рысаваў ёй сумеснае жыццё ў такіх ружовых танах, што проста дыханне захватвала.

Ён іграў з майстэрствам добрага артыста. Ён ішоў упэўнена да сваёй мэты. І афёра ўдалася ў яго руках.

Н. стала цяжарнай і паведаміла аб гэтым Крывашэеву. Яна думала, што ўбачыць радасць на яго твары. Як-жа, будзе дзіцё, яна стане маткаю, а ён—бацькам. Яна і не падазравала, што Крывашэеў будзе ўцякаць ад слова «бацька», як ад чумы.

Паведамленне аб цяжарнасці Н. Крывашэеў выслухаў з выключным хладнакроўем. Спачатку ён маўчаў, потым пачаў крычаць, потым прасіць.

Ён недвусэнсоўна пачаў намякаць Н., што мець дзіця зараз — гэта ні к чаму, і што некаторыя разумныя дзяўчыны ведаюць, як трэба паступіць у такіх выпадках. Вядома, ён канкрэтнага нічога не прапануе, але калі Н. разумная дзяўчына, яна сама павінна зразумець, што трэба зрабіць.

Гэта быў апошні разгавор Крывашэева з Н. Крывашэеў зрабіў сваю справу, ён можа ўйсці. І ён ушоў.

Куды дзеліся гарачыя запэўненні ў каханні і вернасці! Нічога ад гэтага не асталося. Славесная шалуха аб каханні асыпалася, і тут агалілася душа пашляка.

Н. была ў адчаі. Яна не ведала, што рабіць. Яна хацела пакончыць жыццё самагубствам, або забіць у сябе плод. Але яна не зрабіла ні таго, ні другога. Яе падтрымалі падругі-комсамолкі. Яна будзе маткаю. Яна будзе выхоўваць дзіця. Ёй дапамогуць у гэтым комсамол, краіна, партыя.

А Крывашэеў чалавек з поллай душонкай і нізменнымі пачуццямі, гуляе ўжо з другой дзяўчынай, напявае ёй любоўныя матывы са свайго багатага рэпертуара. Вечарамі ён ідзе да сваіх таварышоў і расказвае аб чарговых паходжаннях і перамогах...

Крывашэеў — студэнт совецкага інстытута, комсамолец. Але хіба яго паводзіны даюць яму права называць сябе гэтымі ганаровымі імёнамі?

С. КРАУЦОЎ.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЯ САЛІДАРНАСЦЬ

Мопраўская арганізацыя БССР праводзіць збор сродкаў у карысць жанчын і дзяцей гераічнага кітайскага народа, які змагаецца за сваю незалежнасць супроць японскіх інтэрвентаў. Асабліва актыўна праходзіць збор сродкаў на прадпрыемствах, ва ўстановах, гандлёвых арганізацыях і сярод хатніх гаспадынь Варашылаўскага раёна г. Менска. Калектыў рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў друкарні імя Сталіна ўнёс у карысць кітайскіх жанчын і дзяцей 1.146 рублёў, служачыя Аптэкакіраўніцтва—1.240 рублёў, мопраўская ячэйка хатніх гаспадынь Дома спецыялістаў — 358 рублёў і т. д.

У школах Брагінскага раёна разгарнулася падрыхтоўка да XX гадавіны комсамола і XXI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі. НА ЗДЫМКУ: заняткі музыкальна-харавога гуртка вучняў 6—10 класаў брагінскай сярэдняй школы. Кіруе гуртком настаўнік І. П. Абрамовіч.
Фото Цалуйка (СФ).

ВЯЛІКАЕ СВЯТА СОВЕЦКАГА МАСТАЦТВА

МАСКВА (**Спец. кар. «Звязды»**). 27 кастрычніка працоўныя нашай радзімы будуць адзначаць 40-годдзе Маскоўскага Мастацкага акадэмічнага тэатра СССР імя Горкага (МХАТ'а). Юбілей Мастацкага тэатра — найвялікшае свята совецкага рэалістычнага мастацтва. Яно дастойна будзе адзначана ва ўсёй краіне.

Усесаюзны камітэт па справах мастацтва пры Соўнаркоме Саюза ССР гэтымі днямі распрацаваў рад мерапрыемстваў па правядзенню юбілею МХАТ'а.

На святкаванне ў Маскву будуць запрошаны прадстаўнікі буйнейшых тэатральных калектываў СССР і тэатраў брацкіх рэспублік. У прыватнасці ад БССР на святкаванне юбілею МХАТ'а запрошана 6 чалавек прадстаўнікоў мастацкай грамадскасці рэспублікі. У дні святкавання будуць арганізаваны сустрэчы мхатаўцаў з гасцямі брацкіх рэспублік і мастацкімі самадзейнымі калектывамі сталіцы.

У Маскве ўжо зараз пачынаецца вялікая работа па азнаменаванню слаўнай даты — 40-годдзя МХАТ'а. Праводзіцца рад вечароў і сустрач, чытаюцца даклады аб творчым шляху тэатра і яго лепшых пітомцах. Усесаюзны радыёкамітэт арганізуе перадачу па радыё асноўных спектакляў тэатра, паказваючых гістарычны шлях яго развіцця, а таксама арганізуе перадачу асобных выступленняў вядомых артыстаў тэатра. У Доме актора арганізавана вялікая мастацкая выстаўка «40 год Мастацкага тэатра», якую наведваюць штодзённа сотні працоўных. У файе тэатра будзе наладжана другая выстаўка; падрыхтаваны цікавейшыя фотадакументы гісторыі Мастацкага тэатра.

Ва ўсіх буйнейшых тэатрах Совецкага Саюза будуць праведзены юбілейныя вечары, прысвечаныя МХАТ'у.

Зараз Мастацкі тэатр паказвае совецкаму гледачу 11 пастановак.

Апрача таго, да юбілею ён пакажа «Достигаев» Максіма Горкага і «Горе от ума» А. С. Грыбаедава.

П. КАВАЛЁЎ.

Росквіт народнай творчасці

БАБРУЙСК. 21 кастрычніка адбыўся фінальны вечар трэцяй раённай алімпіяды мастацкай самадзейнасці. Алімпіяда паказала значны рост мастацкай самадзейнасці працоўных раёна.

Сярод выканаўцаў асабліва вызначыўся аркестр сям'і рабочага бабруйскага хлебакамбіната тав. Ліўшыца. Сам тав. Ліўшыц і яго 9-гадовы сын Яша іграюць на скрыпцы, 13-гадовы сын Абраша — на раялі і 15-гадовы сын Моша — на трубе. Яны з поспехам выканалі «Песню аб Сталіне», «Марш танкістаў» і іншыя музыкальныя нумары. Сям'я т. Ліўшыца атрымала прэмію.

Прэміраваны таксама харавыя гурткі саюза шофераў і фельчарскай школы, струнны аркестр рабочых брожскага лесапункта, духавы аркестр швейнай фабрыкі імя Дзяржынскага. Індывідуальныя прэміі атрымалі рабочы соўгаса «Штэрн» тав. Кабардзінскі і член арцелі «Усход» Маліноўская.

***

ПУХАВІЧЫ. Звыш сотні лепшых прадстаўнікоў калектываў мастацкай самадзейнасці соўгасаў, калгасаў і прадпрыемстваў раёна прыняло ўдзел у раённай алімпіядзе.

Найбольшую ўвагу прысутных выклікала выкананне частушак пад акампанімент гармоніка даравітай работніцай соўгаса «Індустрыя» т. Ажойчык. Яна сама склала і з вялікім пачуццём выканала частушкі, прысвечаныя вялікаму Сталіну, радаснаму і шчасліваму жыццю совецкага народа.

З поспехам выступіў ансамбль песні і пляскі калгаса «Пуцілавец». Ансамбль складаецца з 17 чалавек.

Лепшым выканаўцам прысуджана 14 прэмій.

ПАДРЫХТОЎКА ДА XXI ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА

Святочнае ўпрыгожанне Менска

Яркім і маляўнічым будзе святочнае ўпрыгожанне сталіцы ордэнаноснай БССР — Менска. Мастацкае афармленне горада адлюструе велізарныя перамогі СССР, атрыманыя пад кіраўніцтвам слаўнай партыі Леніна—Сталіна, магутнасць Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, недатыкальнасць граніц СССР, гатоўнасць совецкага народа па першаму закліку партыі і ўрада стаць на абарону свяшчэнных граніц соцыялістычнай радзімы.

Гарадская камісія па правядзенню святкавання XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі зацвердзіла план мастацкага афармлення горада. Дом Урада і плошча перад ім будуць афармлены на тэму: «Няхай жыве ВКП(б) — перадавы атрад працоўных СССР»; сквер па Совецкай вуліцы—на тэмы: «СССР—радзіма працоўных усяго свету» і «Мацаваць абарону СССР».

Мастацкія пано, карціны, плакаты і лозунгі, якімі будзе ўпрыгожан Пляц Волі, адлюструюць вялікую сталінскую дружбу народаў СССР. Афармленне будынка Дзяржбанка на рагу Совецкай і Ленінскай вуліц прысвячаецца слаўным гераіням-лётчыцам Валенціне Грызадубавай, Паліне Осіпенка і Марыі Расковай. Мастацкія пано пакажуць выдатны пералёт гераінь па маршруту Масква—Далёкі Усход.

«Шырэй разгорнем магутны стахаўскі рух» — такая тэма афармлення Ленінскай вуліцы. Побач з партрэтамі пачынальнікаў стаханаўскага руху будуць фота лепшых стаханаўцаў прадпрыемстваў горада і паказ іх вытворчых дасягненняў.

Вялікае месца ў святочным афармленні горада зойме пагранічная тэматыка. На тэму «БССР—магутны баявы форпост СССР на заходніх границах» будзе ўпрыгожан сквер на Савецкай вуліцы, а вакзальная плошча — на тэму: «Прывітанне байцам-пагранічнікам — пільным вартавым краіны соцыялізма».

Да мастацкага афармлення горада прыцягнут рад лепшых мастакоў сталіцы БССР.

ПАДАРУНКІ МАЦЕРЫ-РАДЗІМЕ

БАБРУЙСК. Выдатнымі падарункамі мацеры-радзіме сустракаюць маладыя стаханаўцы прадпрыемстваў горада XX гадавіну ВЛКСМ і XXI гадавіну Вялікага Кастрычніка.

Малады токар аўтакалоны Галоўнага ўпраўлення шасейных дарог тав. Малчан 21 кастрычніка выканаў дзённую норму на 663,5 процанта. У гэты дзень ён зарабіў 106 рублёў. 22 кастрычніка за тры гадзіны работы тав. Малчан выканаў чатыры нормы.

На машынабудаўнічым заводзе імя Сталіна комсамольская - маладзёжная брыгада слесараў тт. Харлінскага і Кібісава ў кастрычніку выканала свае заданні на 350—375 процантаў.

Адкрыццё гасцініцы „Беларусь"

Да кастрычніцкага свята сталіцы БССР атрымае выдатны падарунак — новую першакласна абсталяваную гасцініцу «Беларусь». Для гасцініцы пабудован шасціпавярховы будынак на рагу вуліц Валадарскага і Кірава. Яна мае 150 нумароў, у тым ліку 8 «люксаў» з ваннымі пакоямі.

Гасцініца мае рэстаран, летнюю пляцоўку для кафэ, більярдныя, цырульню. На ніжнім паверсе адкрываюцца харчовы і промтаварны магазіны Кошт будаўніцтва і абсталявання гасцініцы «Беларусь» — каля 5 мільёнаў рублёў. Яна адкрываецца 27 кастрычніка. Першымі жыхарамі будуць удзельнікі ўсебеларускай алімпіяды мастацкай самадзейнасці.

МЕХАНІЗАВАНЫ ХЛЕБАЗАВОД У МАГІЛЕВЕ

У Магілеве заканчваецца будаўніцтва механізаванага хлебазавода, які будзе даваць дзесяткі тон хлебных вырабаў у суткі. На заводзе ўстаноўлены механізаваныя печы, пестамясілкі, цестадзяліцельныя і іншыя машыны. Для рабочых абсталёўваюцца душ, пакой адпачынку, раздзявальні і іншыя бытавыя памяшканні. Пуск завода намечан да кастрычніцкага свята.

МАЙСТРЫ РАЗЬБЫ ПА ДРЭВУ

Работнік бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната тав. Бялоў і столяр майстэрні Беларускага тэатра оперы і балета тав. Повышаў перадалі Дому народнай творчасці для выстаўкі выдатную работу—пісьмовы прыбор, выразаны з дрэва. Прыбор складаецца з 11 прадметаў.

Работа выканана з выключным майстэрствам і мастацкім густам.

Растуць асоавіяхімаўскія арганізацыі

Многатысячная армія асоавіяхімаўцаў БССР адзначае падрыхтоўку XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ўзмацненнем абаронная работы на прадпрыемствах, у калгасах, у домаўпраўленнях. У рэспубліцы арганізавана многа новых пярвічных асоавіяхімаўскіх арганізацый і абаронных гурткоў. Лік чыстаў Асоавіяхіма павялічыўся на 54.000 чалавек.

Да дня свята ў Менску, Віцебску, Гомелі і Магілеве адбудзецца выпуск школ снайпераў, варашылаўскіх стрэлкоў і т. д.

КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ПЕСНЮ

У адзнаку слаўнага XX годдзя Ленінска-сталінскага комсамола дырэкцыя і комсамольскі камітэт Беларускага дзяржаўнага кансерваторыі абвясцілі конкурс на напісанне масавай песні і вакальнага твору. Па ўмовах конкурсу музыкальныя творы павінны адлюстроваць гераічную барацьбу комсамола на франтах грамадзянскай вайны, удзел у соцыялістычным будаўніцтве, жыццё шчаслівай совецкай моладзі.

ДЗЕННІК

24 кастрычніка ў Доме партактыва (вялікая зала) з 11 гадз. раніцы да 3 гадзіны дня будзе працягнуты лекцыі па філасофіі. Лектар—праф. Пухоўскі.

Атрыманыя білеты на 23 сапраўдны 24 кастрычніка.

24 кастрычніка ў 7 гадз. вечара ў Доме партактыва (вялікая зала) адбудзецца дыспут для дакладчыкаў, прапагандыстаў і лектараў горада на тэму: «Міжнароднае становішча».

Білеты атрымаць у райкомах і ў Доме партактыва.

Вып. абавязкі адказнага рэдактара
Д. Т. ЛЕБЕДЗЕЎ

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА (памяшк. Дзярж. яўрэйск. тэатра БССР)
24 кастрычніка
ЛЕБЯДЗІНАЕ ВОЗЕРА
Абанемент несапраўдны.
Пачатак у 8 гадзін веч.
Каса з 12 да 3 і з 5 да 8 г. веч.

Кінотэатр «Чырвоная зорка»
«ДРУЗЬЯ»

БЕЛДЗЯРЖДРАМТЭАТР
24 кастрычніка
БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫЯ
Абанемент № 5.
ПАЧАТАК ў 7 гадз. 30 мін. веч.
КАСА АДКРЫТА з 2 г. дня да 8 г. 30 м. вечара БЕСПЕРАПЫННА.

Кінотэатр «Інтэрнацыянал»
БАГАТАЯ НЯВЕСТА

Кінотэатр «Спартак»
ПЕСНЯ АБ ШЧАСЦІ

Дзіцячы кінотэатр
ЛЕНІН У КАСТРЫЧНІКУ

Кінотэатр «Навіны дня»
1. Журнал Маскоўскай студыі кінохронікі № 45.
2. ЧТЗ імя СТАЛІНА (кінанарыс).
3. ЛЮДЗІ МОРА (гукавы фільм у 1 ч.).

БЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ «ГАЛОЎТАБАК»
патрэбен
ШОФЕР
Звяртацца: пляц Волі, 4.

Гукавы кінотэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".
Ад 25 кастрычніка НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ПРЫГОДНІЦКІ ФІЛЬМ
ГАЙЧЫ
Пастаноўка рэжысёра-ордэнаносца В. ШНЭЙДЭРАВА
Вытворчасць кінастудыі «Союздетфильм».
выпуск САЮЗКІНОПРАКАТ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ НАШ ЦЫРК (кіножурнал)
У ФАЙЭ выступленне СІМФАНІЧНАГА АРКЕСТРА пад кіраўніцтвам І. П. КЛАУСА.
Пачатак сеансаў у 6, 7-30, 9-15 і 11 г.
Каса адкрыта з 1 г. дня.

25 кастрычніка ў 7 гадзін вечара
адкрываецца
НАВУКОВАЯ СЕСІЯ
БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА
ЮРЫДЫЧНАГА ІНСТЫТУТА
З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:
25/X — Даклад прафесара-доктара медыцынскіх навук В. Ф. ЧЭРВАКОВА на тэму: «СУДОВАЯ ЭКСПЕРТЫЗА ПА СПРАВЕ АФАНАСЬЕВА».
26/X — Даклад дацэнта-кандыдата юрыдычных навук Л. А. РУДЗІНСКАГА на тэму: «ЛЕНІНСКА-СТАЛІНСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА І СТВАРЭННЕ БССР» (да 20-годдзя БССР).
27/X — Даклад дацэнта А. Н. ЮРАШКЕВІЧА на тэму: «СПРЭЧКІ АБ ДЗЕЦЯХ У ГРАМАДЗЯНСКІМ СУДЗЕ».
29/X — Даклад прафесара П. Н. ГАЛАНЗА на тэму: «ФАШЫСЦКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ ПОЛЬШЧЫ 1935 г.».
30/X — Даклад дацэнта-кандыдата юрыдычных навук М. А. ГЕЛЬФЕРА «УМОЎНАЕ АСУДЖЭННЕ Ў СССР».
30/X — Даклад дацэнта В. Г. ГІНЦВУРГА на тэму: «АБАРОНА Ў ПАПЯРОДНІМ СЛЕДСТВЕ».
31/X — Даклад в. а. дацэнта П. Х. РУБІНЧЫКА на тэму: «30-ГОДДЗЕ РАБОТЫ ЛЕНІНА «МАТЭРЫЯЛІЗМ І ЭМПІРЫОКРЫТЫЦЫЗМ».
1/XI — Даклад ад секцыяй крымінальнага права інстытута права АН СССР прафесара Б. С. МАНЬКОЎСКАГА на тэму: «ПРАДМЕТ І СІСТЭМА КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАВА».
2/XI — Даклад в. а. дацэнта М. Ш. ШТЭЙНГАУЗА на тэму: «КАЛЮЧЫЯ І РЭЖУЧЫЯ ПРЫЛАДЫ Ў КРЫМІНАЛІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫЦЫ».
Сесія будзе адбывацца ў 302 аўдыторыі Універсітэцкага гарадка.
ЗАПРАШАЮЦЦА РАБОТНІКІ СУДА І ПРАКУРАТУРЫ, СЛУХАЧЫ ПРАВАВОЙ ШКОЛЫ І ПРАКУРОРСКІХ КУРСАЎ.
Білеты можна атрымаць у кіраўніка спраў інстытута — Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой 321.
ДЫРЭКЦЫЯ.

УСЁ для ДЗЯЦЕЙ!
У ДЗІЦЯЧЫМ ФІЛІЯЛЕ
МЕНГАЛОЎУНІВЕРМАГА
(рог Ленінскай і Совецкай)
ЁСЦЬ ВЯЛІКІ ВЫБАР ПАДАРУНКАЎ ДЗЕЦЯМ
да кастрычніцкіх свят
СЕКЦЫЯ ЦАЦАК ШТОДЗЕННА ПАПАЎНЯЕЦЦА НОВЫМ АСАРТЫМЕНТАМ
ЦАЦАК
З 25 КАСТРЫЧНІКА ДА 6 ЛІСТАПАДА
ДЗІЦЯЧЫ ФІЛІЯЛ БУДЗЕ ПРАЦАВАЦЬ З 9 г. 30 м. РАНІЦЫ, ДА 9 г. ВЕЧАРА.

МЕНГОРПРАМГАНДАЛЬ
У магазіне № 42 (Совецкая, 67, супроць кіно «Чырвоная Зорка»).
ДА КАСТРЫЧНІЦКІХ СВЯТ
ЁСЦЬ У ВЯЛІКІМ ВЫБАРЫ:
АБАЖУРЫ, ЛЮСТРЫ, настольныя ЛЯМПЫ, ЭЛЕКТРА ЛЯМПЫ
АБО І маскоўскіх, ленінградскіх і менскіх фабрык
БЮСТЫ І ПАРТРЭТЫ ПРАВАДЫРОЎ, МАСТАЦКІЯ КАРЦІНЫ, КАУРЫ, ДАРОЖКІ, ЛЮСТРЫ настольныя і ТРЫЛЬЯЖЫ.
ФАЯНСАВАЯ І ШКЛЯНАЯ ПАСУДА У ВЯЛІКІМ АСАРТЫМЕНЦЕ.
ТАКСАМА ЁСЦЬ У ПРОДАЖЫ: ЭЛЕКТРА-ЧАРЦЕЖНЫЯ СТАНКІ, ЭЛЕКТРА-КАМІНЫ, НЕЗГАРАЕМЫЯ ШАФЫ І СУНДУКІ і розныя МЕТЫЗНЫЯ ВЫРАБЫ.
МЕНГОРПРАМГАНДАЛЬ.

ДА ВЕДАМА НАСЕЛЬНІЦТВА
У мэтах лепшага абслугоўвання пакупнікоў
ДА КАСТРЫЧНІЦКІХ СВЯТ
МЕНГАЛОЎУНІВЕРМАГ (Совецкая, 43) | І ДЗІЦЯЧЫ ФІЛІЯЛ (рог Ленінскай і Совецкай)
з 25 кастрычніка да 6 лістапада
ПАВЯЛІЧВАЮЦЬ ЧАС ГАНДЛЮ
НА 2 ГАДЗІНЫ Ў ДЗЕНЬ.
УНІВЕРМАГ БУДЗЕ АДКРЫТ з 9 гадз. раніцы да 8 г. 30 м. вечара.
ДЗІЦЯЧЫ ФІЛІЯЛ — з 9 г. 30 м. ран. да 9 г. веч.
ДЫРЭКЦЫЯ.

АДРАС РЭДАКЦІІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск Совецкая 49 ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦІІ: рэдактара — 21-832; намесніка рэдактара — 25-188; сакратарыята — 26-830; АДДЗЕЛАЎ: партыйнага — 21-353; совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412; прамысловага — 21-356; сельскагаспадарчага — 21-846; літаратуры, мастацтва навукі і асветы—23-955; масцовай і замежнай інфармацыі — 23-189; аддзел пісем — 20-844, 21-399, 21-885; ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21-356; заг. выдавецтва — 21-358; аб'яў — 25-384.

Уп. Галоўлітбела № Т—5773. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., М., Ш.